№№119–120
(2847–2848)

14 жніўня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

АНОНС

Ярослав РОМАНЧУК:

Я объясняю такую ценовую политику вопиющей некомпетентностью правительства. При ценах на продовольствие выше мировых зарплата в Беларуси по итогам 2007 года составила 326 долларов. В Литве, откуда мы возим более дешевые продукты питания, средняя зарплата превысила 1000 долларов. Средняя пенсия в Беларуси — чуть более 100 евро. Она в 2,5 раза ниже минимальной пенсии в Латвии, Эстонии или Словакии. Хватит сравнивать уровень жизни Беларуси с 1913-м или 1985-м годом! Нам нужно смотреть в будущее. Белорусы достойны европейского уровня зарплат и пенсий.

(Интервью с человеком, который входит в мировую элиту экономистов, читайте в "Народной воле" за 15 августа.)

СКАНДАЛ

Консула Литвы обыскали на границе

Во время поездки в Беларусь литовскому консулу Артурасу Шиланскасу пришлось пережить необычно долгую процедуру досмотра.

Напомним, что, согласно Венской конвенции, дипломаты на границе не подвергаются проверке. По словам второго секретаря Посольства Литвы в Беларуси Кристины Паконите, 21 июля А.Шиланскас на три часа был задержан на белорусской границе. Свои действия пограничники объяснили необходимостью произвести проверку, несмотря на предъявленный им дипломатический паспорт, сообщает литовский сайт Delfi.

По словам заместителя директора департамента по связям с общественностью МИД Литвы Дайвы Римашаускайте, Литва выразила протест в связи с этим событием, но белорусская сторона до сих пор не ответила и причины несоблюдения дипломатического протокола не объяснила.

ЦЕНЫ

Второй раз за месяц подорожала водка

В Беларуси с 12 августа отпускные цены на спирт этиловый пищевой повышены на 6%, а розничные цены на водку — на 4%.

Соответствующее решение содержится в постановлении Министерства экономики №158 "О ценах на алкогольную продукцию", сообщили корреспонденту БЕЛТА в пресс-службе Минэкономики.

К примеру, розничная цена на водку "Крышталь Классическая", "Кленовая", "Белая Русь серебряная" составит 6 тыс. 420 рублей за бутылку емкостью 0,5 л без стоимости посуды.

"Решение об увеличении цен принято по предложению концернов "Белгоспищепром" и "Белбиофарм" в целях компенсации роста стоимости акциза и удорожания зерна", — пояснили в Минэкономики.

В предыдущий раз отпускные цены на спирт этиловый пищевой и розничные цены на водку повышались с 11 июля 2008 года на 10% и 4% соответственно.

ЭКСКЛЮЗІЎ

«БЕЛСАТ»: погляд у заўтра

У адным з папярэдніх нумароў "Народнай волі" было апублікавана інтэрв'ю з вядучым інфармацыйнай перадачы "Аб'ектыў" тэлеканала "Белсат" Алесем ЗАЛЕЎСКІМ. Навіны — важная частка тэлевізійнай праграмы, але не адзіная. Чым запоўнена рэшта тэлепрасторы "Белсата" і хто яе напаўняе?

*За вытворчасць і закуп праграм адказвае праграмны аддзел "Белсата". Адна з яго супрацоўніц — **Вольга ДАНІШЭВІЧ**, выпускніца Беларускага гуманітарнага ліцэя. Яна вядома гледачам "Белсата" як вядучая музычнай перадачы "Запальнічка, ці Відзабойка". Але не толькі. Нядаўна менавіта яна разам з салістам IQ 48 вяла канцэрт лаўрэатаў фестывалю музыкі маладой Беларусі "Басовіша-2008", што адбыўся ў Гарадку недалёка ад Беластока.*

— Чым, акрамя "Запальнічкі", ты, Вольга, займаешся на "Белсаце"?

— Я працую вядучым рэдактарам у праграмным аддзеле. Большасць нашых перадач выходзіць цыклямі, маючы сталы дзень і гадзіну ў сетцы трансляванння. Напрыклад, кожны аўторак пасля галоўнага выпуску "Аб'ектыва" можна пабачыць адзін з нашых дакументальных фільмаў. За вытворчасць перадач адказваюць рэдактары, якіх у аддзеле пяць, і кожны курыруе некалькі цыклавых перадач.

Інакш кажучы, мы кантролюем вытворчасць перадач ад моманту ўзнікнення ідэі да поўнай іх падрыхтоўкі, удзельнічаем у стварэнні канцэпцыі.

Адна з "маіх" перадач — гэта маладзёжная "YoLife!". Мне блізкая гэта тэматыка, я добра разбіраюся ў праблемах маладога пакалення.

Цяпер, калі з'явіліся дзве новыя перадачы (як вынік супрацоўніцтва з "Нямецкай хваляй"), праца стала болей, і калі раней яна творчы рытм, то ён вельмі інтэнсіўны.

— Распавядзі пра перадачы "Нямецкай хвалі".

— Іх у нас дзве: "Еўропа сёння" і "Еўрамакс". Гэта штотыднёвыя тэлечасопісы з рэпартажамі на еўрапейскую тэматыку. Працэс вытворчасці перадач "Нямецкай хвалі" адрозніваецца ад іншых праграм. Мы атрымліваем гатовую праграму, да якой трэба зрабіць беларускую версію. Трэба знайсці перакладчыкаў і дыктараў, з якімі можна стала супрацоўнічаць. Калі тэкст перакладзены, яго карэктуе мовазнаўца, пасля атрымлівае дыктар, і мы разам едзем увечары на запіс. Усё гэта адбываецца за вельмі абмежаваны час і ў хуткім тэмпе. Пры запісы трэба пільнаваць, каб дыктар-мужчына не прачытаў тэкст, прызначаны для дыктара-жанчыны, і наадварот. Часам бывае даволі пацешна...

— Праца на "Белсаце" патрабуе спецыяльнай адукацыі, ці дастаткова досведу?

— У мяне якраз журналісцкая адукацыя ёсць — я атрымала яе ў Беларускім калегіуме. Але яна неабавязковая — важна, што ты ўмееш рабіць і што ў цябе ў галаве.

Мне, напрыклад, вельмі дапамагае лінгвістычная адукацыя — у свой час скончыла факультэт германістыкі ў Лінгвістычным універсітэце. Пашчасціла прайсці двухмесячную практыку на тэлеканале "Нямецкая хваля". Там я даведалася, як працуе сучаснае тэлебачанне, і галоўнае — сама паўдзельнічала ў яго стварэнні.

— Якім ты ўяўляеш сабе "Белсат" праз год?

— За год, бадай, асабліва нічога не зменіцца. Але праз пяць гадоў у Мінску на галоўным праспекце з'явіцца вялікі будынак, у якім будуць працаваць шмат маладых таленавітых беларусаў. А наша тэлебачанне будзе на крок наперадзе ў параўнанні з усімі іншымі тэлеканаламі.

*17:00. Вольга едзе з дыктарамі ў студыю на запіс перадачы "Еўропа сёння". Праграмны аддзел пусцее, але ў той самы момант пачынаецца эфір у студыі "Аб'ектыва". За парадкам у эфіры сочыць **Магда ПЫТЛЯКОЎСКАЯ**.*

— Якія твае абавязкі?

— Я працую ў аддзеле афармлення і рэкламы. Рыхтую анонсы нашых перадач, дакументальных і мастацкіх фільмаў. Акрамя гэтага мы разам з калегай зрабілі рэкламную серыю кароткіх роліка́ў пра цікавых, заслужаных беларусаў. Яшчэ я выдавец, планую афармленне эфіру і анонсы на дзень, а потым, калі пачынаецца эфір, кантралюю, ці ўсё ў парадку. Ці няма, напрыклад, так званага "нуля", гэта значыць чорнага экрана паміж перадачамі.

— Ці можна сказаць, што аддзел афармлення і рэкламы запаўняе сваёй працаю ўвесь эфірны час паміж перадачамі?

— Тэлебачанне — гэта не толькі перадачы ці фільмы, але таксама і тое, што запаўняе "тэлепрастору" паміж імі. Магчыма, гледач не заўсёды заўважае тое, што мы называем анонсамі, якія займаюць пэўны эфірны час, да 60 хвілін штодзённа. Трэба шчыра папрацаваць, каб запоўніць гэтую гадзіну.

— Як ты прыйшла на "Белсат"?

— Я вучылася на аддзяленні беларускай філалогіі, і ад пачатку вучобы Беларусь была для мяне не толькі прадметам, але і захапленнем. Я часта ездзіла ў Беларусь, цікавілася тым, што там адбываецца, чытала беларускія кнігі, слухала музыку. Як толькі даведалася, што ў Польшчы стварэецца тэлеканал "Белсат", знайшла ў знаёмага журналіста нумар тэлефона спадарыні Агнешкі Рамашэўскай-Гузы, дырэктара "Белсата". Калі я патэлефанавала, яна крыху здзівілася і папрасіла дасласць рэзюме і звязацца з яе асістэнткай. Так і зрабіла, але доўгі час не было адказу. Пасля заканчэння вучобы пачала працаваць на польскім тэлеканале TVN24. Там займалася навінамі, але Беларусь увесь час прысутнічала ў майёй грамадзкай дзейнасці. Калі казаць шчыра, то ў мяне была мара — добра было б, каб мая прафесійная праца была звязана з Беларуссю. Прайшоў год пасля таго, як я дасласла рэзюме, і мне патэлефанавалі з "Белсата"... На наступны дзень я кінула працу на TVN24 і прыйшла сюды.

— Ці маеш улюбёную беларускую кнігу, якую музыку слухаеш?

— Вельмі люблю Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні"., Слухаю Вайцюшкевіча, "Троіцу", "Палац". Вельмі люблю беларускую этнічную музыку.

— Чым адрозніваецца праца на "Белсаце" ад працы, скажам, на TVN24?

— Тут усе робяць усё. У нас вельмі маладая каманда, у якой усе ўсяму вучацца, можна сказаць, з нуля. Мы маем шмат абавязкаў. Тое, што на іншым тэлеканале выконваюць некалькі чалавек, у нас робіць адзін. Цяжка, але для маладога чалавека гэта мае свае плюсы. Можна даволі хутка навучыцца тэлевізійнаму майстэрству.

— Чым для цябе стала праца на "Белсаце"? Напрыклад, Алесь Залеўскі сказаў, што для яго гэта найлепш добрая школа.

— Для мяне "Белсат" — гэта найперш здзяйсненне маіх мараў пра тое, каб працаваць у медыях, звязаных з Беларуссю. Ніколі не думала, што гэта будзе магчымымі ў Польшчы...

— Як ты ўяўляеш сабе "Белсат" праз пяць гадоў?

— Мы працуем для рэалізацыі агульнай справы. У Беларусі такое тэлебачанне сёння не можа існаваць. Я думаю, што праз пяць гадоў усе "белсатаўскія" беларусы змогуць спакойна жыць у Беларусі, працаваць на сваёй Радзіме. А я застануся тут, у Польшчы, і буду карэспандэнткай тэлеканала.

...Эфір заканчваецца ў 15 хвілін першай гадзіны ночы апошнім выпускам "Аб'ектыва", які вядзе Алесь Залеўскі. "Гэта ўсё на сёння. Да сустрэчы заўтра. Беражыце сябе!" — развітваецца вядучы. Развітваецца, каб раніцай зноў сустрэцца з беларускімі тэлегледачамі.

Пытанні задаваў Сяргей ПЕЛЯСА.

АБЗАЦАМ

Сталічным урачам абяцаюць павысіць заробкі

Сталічным урачам, якія працуюць у сістэме дзяржаўнай медыцыны, у верасні павысяць службовыя аклады. Пра гэта паведаміў старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый Піневіч. Ён адзначаў, што на працягу апошніх дзесяці гадоў праблема дэфіцыту медыцынскіх кадраў у Мінску не страчвае сваёй актуальнасці. Менавіта заробкамі ўлады вырашылі заахвочваць спецыялістаў заставацца ў медыцыне.

Адпусцілі з войска на выбары

Адзіны кандыдат ад спісу АДС па Лунінецкай выбарчай акрузе №13 Віталь Каратыш быў адпушчаны з войска на тры дні для таго, каб падаць дакументы на рэгістрацыю ў якасці кандыдата. Два дні ён збіраў подпісы і асабіста сустракаўся з выбаршчыкамі. "Калі буду зарэгістраваны ў якасці кандыдата ў дэпутаты, то, паводле заканадаўства, мушу быць адпушчаны з войска на час правядзення агітацыі", — патлумачыў Віталь.

Акцыянаваць «Беларусь-калій» не плануецца

Акцыянаванне "Беларусь-калія" найбліжэйшым часам не плануецца, заявіў генеральны дырэктар РУП "БА "Беларусь-калій" Андрэй Башура. *"Мы не трапілі ў спіс прадпрыемстваў, якія павінны акцыянаваць з наступнай прыватызацыяй. "Беларусь-калій" — гэта залатое яйка для Беларусі"*, — падкрэсліў гендырэктар. Паводле яго слоў, прадпрыемства сёння *"моцна стаіць на нагах, шмат будуецца, шмат укладваецца інвестыцыі на развіццё і мадэрнізацыю вытворчасці і сацыяльную сферу"*.

ПРОЕКТЫ

АЭС в Беларуси: есть варианты

"Мы очень тщательно подходим к вопросу выбора площадки для строительства АЭС и участников реализации проекта", — было заявлено на прошедшей в Минске пресс-конференции.

По словам замминистра энергетики **Михаила Михадюка**, уже получены ответы от трех основных компаний, работающих на мировом рынке. Это — AREVA (Франция, Германия), Westinghouse-Toshiba (США, Япония) и государственная корпорация "Росатом". В ответе главы AREVA А.Ловержона сообщается, что представители компании готовы встретиться с представителями Минэнерго для более глубокого рассмотрения возможностей сотрудничества в дополнение к ранее проведенным консультациям.

Руководитель "Росатома" **Сергей Кириенко** подтвердил готовность корпорации к реализации проекта "под ключ" и проработке вопроса о финансировании.

А вот руководство американо-японской компании заявило, что сотрудничество возможно только после заключения соглашения между правительствами США и Беларуси.

Кроме того, в Минэнерго поступило предложение Китайской Гуандуанской ядерно-энергетической корпорации, специализирующейся на строительстве и эксплуатации атомных электростанций. В настоящее время все предложения рассматриваются белорусской стороной.

Как отметил на пресс-конференции председатель президиума НАН Беларуси **Михаил Мясникович**, проведенные исследовательские работы на Краснополянской, Кукшиновской и Островецкой площадках показывают, что запрещающих моментов для возведения АЭС на каждой из них нет, и в сентябре правительственной комиссии будет предложен вариант решения проблемы.

Что же касается недавно принятого закона "Об использовании атомной энергии", то, как заявили заместитель министра иностранных дел **Виктор Гайсенок** и председатель постоянной комиссии Палаты представителей **Анатолий Павлович**, его положения определяют принципы правового регулирования деятельности по использованию атомной энергии, основным из которых является приоритет радиационной безопасности и защиты жизни и здоровья нынешнего и будущих поколений, окружающей среды. Проект закона прошел предварительную экспертизу в МАГАТЭ, которая, кстати, намерена оказать Беларуси помощь при подготовке квалифицированных кадров для работы на АЭС.

Игорь ГРИШАН.

ЧУЛІ?

Прафсаюз РЭП судзіцца з Мінгарвыканкамам

Маскоўскі суд Мінска прызначыў дату пачатку судовага працэсу па справе "Прафсаюз РЭП супраць Мінгарвыканкама" — 19 жніўня. Пра гэта паведаміў старшыня прафсаюза Генадзь Фядыніч.

Напрыканцы чэрвеня шасцёра прадстаўнікоў прафсаюза падалі заяўку ў Мінгарвыканкам на правядзенне збору ініцыятыўнай группы грамадзян, якія распачалі б збор 50 тысяч подпісаў, неабходных для заканадаўчага вярання бясплатнага праезду для дзяцей, школьнікаў, студэнтаў, пенсіянераў. РЭП прасіў тры магчымыя пляцоўкі ў Мінску: Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр, парк імя 50-годдзя вялікага Кастрычніка і плошчу Бангалор, каб 13 ліпеня правесці ўстаноўчы сход группы.

Вечарам 8 ліпеня (праз чатыры дні пасля выбуху ў Дзень незалежнасці) Мінгарвыканкам адмовіў прафсаюзу ў правядзенні на тэрыторыі Мінска любога масавага мерапрыемства, ніяк не матываваўшы сваё рашэнне.

НУ І НУ!

Штраф за «незразумелую мову»

Прадпрымальніку з рынку "Ждановіны" Алесю Талстыку далі 140 тысяч рублёў штрафу за тое, што ён... размаўляў на беларускай мове.

— Нейкая жанчына напісала на мяне скаргу ў абласную падатковую інспекцыю, што я размаўляю з пакупнікамі на незразумелай мове, — распавядае прадпрымальнік. — "Незразумелая мова", наколькі я зразумеў, гэта беларуская, на якой я заўсёды размаўляю. Скаргу перадалі ў раённую падатковую інспекцыю, але азнаёміўшы мне не далі. І прысудзілі мне штраф — 140 тысяч рублёў. Па нейкіх там правілах яны маюць права прымаць такія рашэнні. Аргументацыя была такая: маўляў, за некарэктную размову з пакупнікам. Хоць тая жанчына наогул у мяне нічога не купляла. Проста прыйшоў чалавек, які пачаў лаяцца і абражаць мяне. Калі б гэта быў мужчына, дык я з ім увогуле па-іншаму пагутарыў бы...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Еврокомиссия проводит тендер на поставку оборудования для строительства приграничного грузового терминала «Козловичи-2»

Согласно условиям, тендер проводится по трем лотам: ограждение с воротами общей длиной 3,9 км, компьютерное и сетевое оборудование (всего 34 позиции), а также инженерное оборудование (подъемник, уборщик и другая техника).

К участию в тендере приглашаются юридические лица из государств ЕС, государств-кандидатов на вступление в ЕС, а также стран, в которых действует представительство TACIS, т. е. в том числе из Беларуси. Одно юрлицо может подавать документы для участия в тендере по нескольким лотам.

Предложения принимаются в представительстве Европейской комиссии в Киеве. Время проведения тендера — 2 октября. Подписание контракта запланировано на 10 ноября.

Новый таможенный терминал в два раза увеличит пропускную способность действующего пункта "Козловичи-1".

Стоит отметить, что пограничный терминал "Козловичи-2" — самый дорогостоящий из всех проектов Еврокомиссии в Беларуси.

Марина РАХЛЕЙ. БелаПАН.

SVERIGES AMBASSAD

Пасольства Швецыі Рэспубліка Беларусь

Шведскае пасольства ў Мінску шукае супрацоўнікаў

Швецыя адкрывае сваё пасольства ў Беларусі і ўвосень мае намер распачаць падбор мясцовага персаналу. Адкрыццё пасольства запланавана на зіму, таму непасрэдна набор супрацоўнікаў будзе ажыццяўляцца ў канцы 2008 — пачатку 2009 г.

Больш інфармацыі пра ўмовы і працэдуру пошуку супрацоўнікаў можна атрымаць на хатняй старонцы Аддзялення пасольства Швецыі ў Мінску — **www.sweden.by**

ПОРТРЕТНАЯ ГАЛЕРЕЯ

Да, мы можем!

"Народная воля" продолжает знакомить читателей с теми представителями демократических сил, кто в этом году пробует получить депутатский мандат. Первым претендентом, который сдал в избирательную комиссию тысячу подписей за свое выдвижение, стал Александр Волчанин из Жодино.

— Как вы оцениваете нынешнюю политическую ситуацию в Беларуси, положение в Объединенных демократических силах, какие шаги они должны сделать?

— Считаю, что политическая ситуация в Беларуси могла бы быть намного лучше, чем она есть на сегодняшний день. Этому мешают как объективные, так и субъективные факторы. Пока госаппарат не будет замечать оппозицию и применять на практике те хорошие наработки, которые у нее есть, а оппозиция не будет замечать положительные моменты в действиях власти, политическая обстановка не изменится в лучшую сторону. Как-то я разговаривал с одним сторонником оппозиции об одном спортивном мачте, где белорусы проиграли, и он заявил, что это хорошо. Я спросил: "Почему?" В ответ услышал, что все проигрыши якобы нам на руку. А где же национальная гордость, интересы? Вот когда мы научимся ценить наши победы вместе — улучшится и ситуация в Беларуси. Положение в Объединенных демократических силах я не хочу обсуждать до тех пор, пока сопредседатели не отчитаются о проделанной работе на предстоящем Конгрессе.

— Расскажите о вашей работе в Объединенной гражданской партии. Каково сейчас положение в партии? Есть ли у нее перспектива? Что можно сделать для усиления ее популярности?

— В Объединенной гражданской партии я являюсь председателем Комиссии по вопросам минимизации последствий аварии на ЧАЭС. По роду своей деятельности отстаиваю права пострадавших от аварии на ЧАЭС. Авария на ЧАЭС — это ярчайший пример того, как люди, рискуя жизнью, геройски выполнили свой долг. На мой взгляд, человек, живущий в нашей стране, должен иметь гарантии того, что в случае, если он будет вынужден подвергнуть свою жизнь опасности, защищая нашу страну, то впоследствии он будет иметь достойную государственную защиту и поддержку. В противном случае трудно ожидать от людей не то что героизма, но и простого исполнения своего долга. В Объединенной гражданской партии я вижу большой потенциал. Это показал недавно прошедший съезд партии. В ОГП, как в никакой другой партии, собрались люди с большим жизненным опытом и знаниями, особенно в области экономики. Если некоторые партии и политики занимаются только критикой, то ОГП разрабатывает законопроекты и предлагает их правительству, выносит на обсуждение общественности. А что касается усиления позиций партии, то ее популярность можно усилить только ежедневной работой с населением.

— Почему вы считаете, что Объединенным демократическим силам все-таки надо участвовать в грядущих выборах?

— Только контроль над исполнительной властью даст людям новые возможности жить лучше. Государственный чиновник, по моему разумению, не может одновременно расходовать статьи бюджета и одновременно контролировать самого себя. Это не поддается никакой логике. Если государство не дает возможности представителям оппозиции работать в органах исполнительной власти, пусть даст возможность контролировать власть. Честно избранные депутаты от Объединенных демократических сил смогут защитить справедливость, добиться контроля над чиновниками.

— Как вы оцениваете появление единого списка кандидатов от ОДС?

— На одном из заседаний с участием представителей из единого списка кандидатов от Объединенных демократических сил зашел разговор о том, что власти могут выбрать самых слабых кандидатов и дать им возможность пройти в парламент. Получается, виновата власть? А кто выдвигал кандидатов? Оппозиция, то есть мы с вами. Если мы не сможем выдвинуть достойных кандидатов, нам нечего делать в политике. И хотите вы или не нет, а власть будет использовать нашу слабость. Пора быть системной оппозицией.

— Чего вы ждете от грядущей парламентской кампании? Будет ли режим фальсифицировать выборы или пойдет на некую либерализацию? И, соответственно, как следует вести себя Объединенным демократическим силам? На каких условиях участвовать в этих выборах?

— От грядущих парламентских выборов жду новых возможностей. Беларуси предоставляется шанс выхода из той ситуации, в которой она находится. Мы прекрасно понимаем, какие дискуссии проходят в Администрации президента. Все будет зависеть от воли президента и его окружения. Кто победит, ястребы или голуби? Я думаю, возобладает здравый смысл, и власть пойдет на некоторую либерализацию.

— От какого избирательного округа вы баллотируетесь? Расскажите о своем округе. Какие проблемы в нем существуют, что волнует людей?

— Я намерен баллотироваться по Жодинскому избирательному округу №86. Округ большой. В него входит, кроме города Жодино, часть Смолевичского и Борисовского районов. Проблем хватает. Это и строительство больницы, школы, детского сада, дороги, подростковая преступность, занятость, правовая и социальная защита, вопросы местного самоуправления.

— Что бы вы хотели сказать своим избирателям в первую очередь? Что, на ваш взгляд, является самым главным? Девиз, с которым вы идете на выборы.

— Мой девиз: "Да, мы можем!". Мы можем избрать депутата, который не будет молча поднимать руку, не посоветовавшись с избирателями своего округа, и к которому всегда можно прийти без предварительной записи. Депутата, который будет на стороне народа, будет контролировать бюджет и действия власти, будет реально защищать население от произвола местных властей. Все важные вопросы решать совместно со своими избирателями.

— Каковы будут ваши первые действия в качестве избранного депутата Палаты представителей?

— Поблагодарить избирателей за совместную победу и начать претворять обещания в жизнь.

Беседовал Михаил КРИВОВ.

ДЛЯ СВЕДЕНИЯ

Александр Волчанин родился 21 сентября 1962 года в городе Борисове. Провел детство в деревне Лавница Борисовского района. С малых лет знает цену крестьянскому труду. Учился в средней школе №13 г.Борисова. Окончил Борисовское медицинское училище. Заведовал фельдшерско-акушерским пунктом в деревне Зоричи Велятичского сельсовета. Служил в рядах Советской Армии. С 1985 года по настоящее время работает выездным фельдшером высшей категории на Станции скорой медицинской помощи в городе Жодино. Совмещает работу на Станции скорой помощи в Смолевичах. Имеет высшее образование: окончил Московский государственный социальный университет по специальности "социальная работа". Некоторое время работал заместителем директора социального центра. Участник ликвидации последствий аварии на Чернобыльской атомной электростанции. Член Политсовета Объединенной гражданской партии. Председатель Правления "Союз Чернобыль — Беларусь", организации, зарегистрированной в Украине. Депутат 22-го и 23-го созывов Жодинского городского Совета.

Улады заахвочваюць канкурэнцыю паміж сваімі кандыдатамі

Кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў вылучаны 44 дзеючыя парламентарыі. Аб гэтым паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына.

Паводле яе даных, 42 цяперашнія дэпутаты Палаты прадстаўнікоў вылучаюцца ў якасці кандыдатаў у дэпутаты парламента наступнага склікання шляхам збору подпісаў, а 2 вылучаны працоўнымі калектывамі.

У прыватнасці, атрымаць новы дэпутацкі мандат маюць намер Анатоль Ваньковіч, Алег Вялічка, Ларыса Вершаловіч, Уладзімір Здановіч, Яўген Казімірчык, Аляксандр Гудкоў, Валерый Лектараў, Уладзімір Скавародка, Сяргей Касцян, Міхаіл Русы, Аляксандр Шацько, Уладзімір Баршчоў, Таццяна Голубева, Міхаіл Арда, Георгій Камянецкі, Віктар Гумінскі, Іван Семяненя, Мікалай Чурсін, Вольга Абрамава, Генадзь Давыдзька, Анатоль Красуцкі, Уладзімір Крук, Галіна Мазуркевіч, Галіна Палянская, Анатоль Паўловіч, Галіна Юргелевіч, Аляксандр Юшкевіч і іншыя.

Аднак трэба разумець, што не ўсіх сённяшніх дэпутатаў, якія маюць намер зноў атрымаць мандат, зразумела ўлада. Так, Сяргей Касцян канкуруе са старшынёй райвыканкама. І Касцян ужо скардзіцца, што ягоны сапернік выкарыстоўвае адміністрацыйны рэсурс. "Прадстаўніку маёй ініцыятыўнай групы ў саўгасе-камбінаце "Каменка" старшыня гэтага камбіната ўзяў ды парваў пасведчанне", — са здзіўленнем расказаў Касцян журналістам.

Па мінскай Купалаўскай выбарчай акрузе зарэгістраваны дзве ініцыятыўныя групы сённяшніх дэпутатаў — Галіны Мазуркевіч і Генадзя Давыдзькі. А мандат жа адзін.

Мікола СТАТКЕВІЧ:

«Калякін называе мяне дурнем»

Старшыня аргкамітэта па стварэнні "Еўрапейскай кааліцыі" Мікола Статкевіч растлумачыў карэспандэнту "Народнай волі", чаму не трэба байкатаваць будучыя парламенцкія выбары і чаму Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы такімі, на яго погляд, не з'яўляюцца.

Сустрэча з палітыкам прайшла ў адной са сталічных кавярняў. На яе было запрошана невялікая група журналістаў. І пад сок з кавай на працягу паўтары гадзіны Статкевіч дзяліўся сваімі думкамі з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі.

"Яшчэ ў 2004 годзе, калі "Пяцёрка+" пераўтварылася ў Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы (АДС), была дасягнута дамоўленасць, што ўтвораная структура будзе стаяць на еўрапейскай платформе, — гаворыць Статкевіч. — І кожны суб'ект, які сюды ўваходзіць, будзе мець роўныя правы з усімі астатнімі. І што мы бачым зараз? "Еўрапейская кааліцыя" прапанавала прадстаўнікам АДС аб'яднаць намаганні ўсіх дэмакратычных кандыдатаў у барацьбе супраць фальсіфікацый. А замест падтрымкі з боку АДС мы бачым нейкую незразумелую рэакцыю. Я, напрыклад, спрабую прайсці ў дэпутаты па той жа самай акрузе, што і Сяргей Калякін. Дык замест таго, каб дапамагаць і не сварыцца адзін з адным, Калякін называе мяне ледзьве не дурнем. Хаця пасутнасці мы павінны рабіць адну справу".

Растлумачыў Статкевіч сваю пазіцыю і адносна байкоту парламенцкіх выбараў.

"Байкот мы праходзілі восем гадоў таму, — гаворыць Статкевіч. — Пад гэтую кампанію былі атрыманы вялікія грошы, і людзі ахвотна нічога не рабілі. Для байкоту ў апазіцыі няма рэсурсу. Зараз да байкоту актыўна заклікае "Малады фронт" — яны добра робяць гэтую справу, але аб'ектыўна многія маладафронтаўцы папросту не дасягнулі выбарчага ўзросту. Удзел у выбарчай кампаніі браць трэба хаця б для таго, каб выкрыць фальсіфікацыі, якія будуць з боку ўлад. Браць удзел у кампаніі неабходна з-за таго, што гэта легальная магчымасць пагаварыць з людзьмі, атрымаць грошы на друкаванне ўлётак, атрымаць эфірны час.

Скажу шчыра: канкрэтнай задачы прайсці ў парламент у мяне няма. Выбарчую кампанію прадстаўнікі "Еўрапейскай кааліцыі" будуць выкарыстоўваць з мэтай інфармавання насельніцтва. Мы будзем даносіць людзям тое, што Беларусь павінна быць у Еўропе і інтэгравацца з еўрапейскімі краінамі".

Віталь ГАРБУЗАЎ, "Народная воля".

За намер удзельнічаць у выбарах начальства пачало цкаваць участковага

Па Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе №19 заявіў аб намеры вылучыцца кандыдатам у дэпутаты 36-гадовы Андрэй Левінаў — участковы інспектар Чыгуначнага РАУС.

Падача капітанам Левінавым дакументаў на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы стала нечаканасцю і для ўлад, і для апазіцыі, паколькі гэты афіцэр быў у баку ад палітыкі.

Акруговая камісія ініцыятыўную групу ўчастковага інспектара зарэгістравала, але міліцэйскае кіраўніцтва вобласці падобную самадзейнасць (пайсці ў дэпутаты) вырашыла выкараніць. Так, каб астатнія супрацоўнікі міліцыі паўтарыць падобны подзвіг не рызыкнулі.

Спачатку прайшліся па персанальных падапечных Андрэя Левінава — тых, хто павінен знаходзіцца пад асаблівай увагай участковага: кліентах інспекцыі па справах непаўналетніх, крымінальна-выканаўчай інспекцыі... Першая атака правалілася. Участковы Левінаў, да здзіўлення правяраючых, аказаўся добрасумленным міліцыянерам. Падапечныя ведалі свайго ўчастковага і па прозвішчы, і ў твар. Памяталі, калі і на якую тэму капітан Левінаў праводзіў з імі гутаркі. Пад такую маштабную праверку падпаў толькі ўчастак Андрэя Левінава: праца з падапечнымі астатніх участковых Чыгуначнага РАУС правяраючых не цікавіла.

Не паслухаўся афіцэр Левінаў і прамых прапаноў-пагроз звольніцца з міліцыі, якія прагучалі з вуснаў розных кіраўнікоў РАУС. І тады УУС Віцебскага аблвыканкама пайшло ва-банк. Падпалкоўнік Пранько пасля рэгістрацыі Андрэем Левінавым ініцыятыўнай групы забраў з Чыгуначнага РАУС усе матэрыялы, па якіх участковы Левінаў прыняў рашэнне не ўзбуджаць крымінальныя справы (такіх з пачатку гэтага года набралася больш за два дзесяткі). Дадзеныя рашэнні ўчастковага былі правераны начальнікам РАУС і пракурорам раёна, якія не ўгледзелі парушэнняў законнасці ў дадзеных матэрыялах. Тым не менш, падпалкоўнік абласнога УУС вылучыў чатыры матэрыялы (за красавік—май) і накіраваў да намесніка пракурора Чыгуначнага раёна (у дадзены момант — часова выконваючага абавязкі пракурора) з прапановай: рашэнні аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы адмяніць. Намеснік пракурора ў капітанскіх пагонах (юрыст 1-га класа) такую прапанову міліцэйскага падпалкоўніка задаволіў. А пракурор вобласці, дарадца юстыцыі 1-га класа Дыско, загадаў узбудзіць у дачыненні да прэтэндэнта на дэпутацкі мандат ўчастковага Левінава дысцыплінарную вытворчасць.

Мяркуючы па разгорнутым шырокамаштабным цкаванні капітана Левінава, далейшы ўдзел у выбарчай кампаніі яму прыйдзецца праводзіць ужо ў статусе былога супрацоўніка міліцыі, паведамляе грамадская ініцыятыва "Праваабаронцы за свабодныя выбары".

ІНІЦЫЯТЫВА

Дэмсілы патрабуюць тэледэбатаў

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы Беларусі (АДС) рыхтуюць лісты да кіраўніцтва дзяржаўнага радыё і тэлебачання з прапановай правесці перадвыбарныя дэбаты. Пра гэта 7 жніўня на пасяджэнні прэзідыума АДС заявіў лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька**.

"Я прааналізаваў інфармацыю, якая гучыць на дзяржаўным радыё і тэлебачанні. Ствараецца ўражанне, што ў краіне наогул не праходзіць выбарчая кампанія. Інфармацыі аб палітычных сілах, якія вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты, аб іх перадвыбарных платформах наогул няма", — зазначыў ён.

Аб'яднаныя дэмсілы маюць намер прапанаваць правесці дэбаты, на якіх будуць абмяркоўвацца палітычныя і сацыяльна-эканамічныя праблемы, якія найбольш хвалююць выбаршчыкаў.

"Гэта дапаможа ім зрабіць свядомы выбар на выбарчых участках", — упэўнены А.Лябедзька.

Кіраўнік назіральнікаў АБСЕ ў Мінску

Герт Арэнс, кіраўнік місіі назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ на парламенцкіх выбарах у Беларусі, ужо некалькі дзён знаходзіцца ў нашай краіне.

Ён сустрэўся з членамі Цэнтрвыбаркама. Сустрэча была па-дыпламатычнаму стрыманай, паколькі менавіта спадар Арэнс узначальваў місію, якая не прызнала дэмакратычнымі апошнія прэзідэнцкія выбары.

Махлярства з датамі

Заява з подпісамі 108 грамадзян аб вылучэнні ў склад Жодзінскай акруговай камісіі праваабаронцы і сябра Сойму Партыі БНФ Аляксея Лапіцкага проста не разглядалася.

Адпаведнае пасяджэнне, на якім фарміравалі акруговыя выбарчыя камісіі, прайшло ў Мінаблвыканкаме 14 ліпеня. Нікога з незалежных назіральнікаў і зацікаўленых асоб, у тым ліку самога прэтэндэнта, на яго не дапусцілі. І Лапіцкі сваё неўключэнне пачаў абскарджваць.

7 жніўня ён атрымаў афіцыйны адказ ад начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Мінаблвыканкама Міхаіла Амельянчука. На сваё здзіўленне, з гэтага адказу Лапіцкі даведаўся, што на адзначаным пасяджэнні ягоную заяўку нават не разглядалі. Аказваецца, дакументы праваабаронцы, накіраваныя па пошце 07.07.2008 года замоўным лістом з Жодзіна, не паспелі дайсці да адрасата ў Мінску да 11.07.2008 года. Нейкім чынам абласныя ўлады атрымалі іх толькі ў суботу, 12.07.2008 года.

Што ж здарылася з заявай праваабаронцы, які адаслаў свае дакументы аж за 5 дзён да апошняга тэрміну прыёму і за 8 дзён да планаванага пасяджэння ў аблвыканкаме?

Лапіцкі пачаў разбірацца і высветліў, што пошта працуе добра. Ягонае замоўнае адпраўленне за пэўным нумарам, як і патрэбна, было своечасова дастаўлена па прызначэнні. Аказваецца, заява з 108 подпісамі грамадзян была дастаўлена і атрымана ў Мінскім аблвыканкаме 09.07.2008 года! А ўжо адваротнае паведамленне Лапіцкаму аб дастаўцы пошта праштампавала 11 чэрвеня. Пра што і сведчаць паштовыя квіткі. Так не хацелі абласныя начальнікі бачыць Лапіцкага ў акруговай камісіі, што пайшлі на падман.

Па дадзеным выпадку Аляксей Лапіцкі накіраваў адмысловыя заявы ў ЦВК і Пракуратуру.

Алесь ВОЛЬНЫ.

Выборная гонка: взгляд гомельского активиста

Июнь дал старт новой избирательной кампании. О ее результатах спорить не приходится: они известны уже сейчас. Однако любая избирательная кампания имеет свою специфику, на которой и хотелось бы остановиться.

Общие настроения

Если в двух словах, то парламентские выборы в их нынешнем виде не интересны в Беларуси никому: ни власти, ни оппозиции, ни избирателям.

Для властей парламентская кампания в значительной степени даже неприятна. Опять нужно будет делать вид, что действительно проходят выборы и добросовестно учитывается каждый голос избирателя. Снова придется "гнать" народ на участки, шантажировать строптивых председателей избирательных комиссий и выслушивать упреки со стороны Запада и оппозиции в фальсификациях. Да и просто не хочется в очередной раз напрягаться и давить нижестоящих чиновников, подвергаясь давлению со стороны тех, кто выше. И, вообще, не понятно, ради чего нужно в очередной раз окунаться в нечистоты: вопрос власти-то не решается!

Оппозиции парламентская кампания не интересна по нескольким причинам. Во-первых, выборов снова не будет, во-вторых, парламент не имеет никаких властных полномочий и выполняет декоративно-прикладную функцию при Администрации президента, и наконец, в-третьих, в таком виде все это уже было и было не раз. Нет новизны, нет интриги, нет, соответственно, и интереса.

Избирателям выборы просто не интересны. И потому, что все понимают, что от парламента ничего не зависит. И потому, что политика уже порядком надоела.

Вновь возникшие обстоятельства

При всей внешней схожести с предыдущими избирательными кампаниями последнего десятилетия есть нечто и новое, не дающее покоя властям и вселяющее маленький оптимизм в оппозицию.

Вызовы времени не могут обходить стороной Беларусь, находящуюся в самоизоляции от демократического мира. Однако в условиях перманентной нефтегазовой войны с Россией подобная самоизоляция губительна. Как губительно и сближение с Западом: любая закрытая или полузакрытая система при взаимодействии с открытым внешним миром также становится открытой, то есть старая система власти попросту разрушается. В силу этого идет поиск такого пути, при котором можно было бы сохранить статус-кво внутри страны, но поменять формат отношений с другими странами, в первую очередь европейскими, касаясь исключительно сферы экономических отношений. При этом можно даже повоевать с Америкой: наличие внешнего врага, пусть и выдуманного, важно в условиях авторитаризма для консолидации общества вокруг правителя. А вот реверансы в сторону Европы сейчас крайне необходимы, и мы их наблюдаем. Освобождение некоторых политзаключенных уже произошло, но этого мало. Нужно еще создать видимость проведения более-менее честных выборов, к которым у европейцев трепетное отношение. А это серьезная проблема. Конечно, прорабатываются варианты, и намеки на то, что в парламент могут быть назначены и некоторые люди из оппозиции, не случайны. Однако тут возникает определенная зависимость от оппозиции, которая может спутать карты.

Упущенная возможность

Ситуация складывалась таким образом, что оппозиция по сравнению с властями имела определенное преимущество. Соответственно, ее главной задачей в предстоящей кампании являлось максимальное использование своего преимущества для изменения правил политической игры. Речь в первую очередь шла о последовательности действий и принципиальности. Еще зимой текущего года была озвучена позиция ОДС об условиях участия в выборах. Ключевым пунктом является то, что в состав избирательных комиссий всех уровней должны были быть включены представители демократической коалиции. Для власти введение в состав комиссий людей из демократического лагеря крайне нежелательно. И уже сегодня известно: демпредставители вошли далеко не во все комиссии. И демократы во многом сами виноваты: не смогли они более жестко сформулировать свое требование по формуле: "Нет наших представителей в комиссиях — не будет и наших кандидатов!"

В этом случае перед властью возникла бы серьезная проблема. Выборы без кандидатов ОДС признаны не были бы.

Таким образом, демократы уже первый тур выборов проиграли. Не проиграть бы и все остальные.

Василий ПОЛЯКОВ, член ОГП.

Гомель.

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 ЖНІЎНЯ 2008 г.

Па прыбытках і дывідэнды

У якасці дасягнення варта занесці ў Кнігу рэкордаў Гінеса дывідэнды, налічаныя па выніках мінулага года ўладальнікам каштоўных папер Аршанскага завода швейных машын. Акцыянерам гэтага прадпрыемства на адну акцыю налічана 0,2396 рубля.

Не ўзрадавалі дывідэнды і акцыянераў ААТ "Віцебсклес". Тут на акцыю выпала менш за 7 тыс. рублёў. Па 26 рублёў на акцыю налічыла ААТ "Віцебскі камбінат шаўковых тканін". Акцыянерам гэтых прадпрыемстваў застаецца толькі зайздросціць уладальнікам каштоўных папер віцебскага гандлёвага ААТ "Веста", дзе дывідэнды на акцыю склалі 6115 рублёў. Амаль па 1100 рублёў на акцыю выпала ў тэхна-гандлёвым цэнтры "Гарант", па 2000 рублёў — на заводе "Этон" у Новалукомлі. А самыя буйныя на Віцебшчыне дывідэнды па выніках 2007 года атрымалі ўладальнікі каштоўных папер віцебскага ААТ "Кераміка" — па 7368 рублёў на акцыю. Таксама не Бог ведае што, але ўсё ж такі... Таму сёння многія ветэраны прадпрыемства шкадуюць, што на пачатку 90-х гадоў, калі на "Кераміке" можна было абмяняць чэкі "Маймасць" на акцыі або набыць каштоўныя паперы за ўласныя грошы, не зрабілі гэтага: адны надта верылі ў поспех акцыянірання, другія (такіх была большасць) не мелі лішніх грошай. Праўда, не зробяцца багацеямі і тыя, у каго акцыі ёсць. У шараговых рабочых і служачых у сярэднім — па 15—20 акцый. Адчувальны вынік налічаных дывідэндаў хіба што ў прадстаўнікоў адміністрацыі, сярод якіх ёсць уладальнікі соцень і нават тысяч акцый. Так, юрыскансульт "Керамікі", прадбачлива набыўшы ў свой час 1000 акцый свайго прадпрыемства, цяпер атрымае каля 7,4 мільёна рублёў. Праўда, самі акцыянеры "Керамікі" не ў захапленні ад налічэнняў, але што ж тады казаць абсалютнай большасці акцыянераў Віцебшчыны, калі з 200 ААТ вобласці амаль палова не прыняла рашэння аб выплаце дывідэндаў? У адных няма прыбыткаў, а другія не хочуць дзяліцца імі з пабочнымі ўладальнікамі каштоўных папер...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

АКТУАЛЬНОЕ ИНТЕРВЬЮ

Кредиты для Беларуси: благо или петля на шее?

В последнее время в Беларуси довольно широко стала применяться практика получения внешних займов. В чем конкретно она проявляется и во что может вылиться? На эти вопросы отвечает доктор экономических наук, профессор, экс-председатель Национального банка РБ, почетный председатель Объединенной гражданской партии ***Станислав БОГДАНКЕВИЧ****.*



Можно "вылететь в трубу"

— Станислав Антонович, больше всего внешних займов Беларусь получает от России. Каковы они и в чем их суть?

На сей раз Саакашвили просчитался, полагая, что может захватить Южную Осетию, не вызвав ответной реакции. Южная Осетия действительно находится в пределах границ Грузии, так же, как и Чечня находится в пределах Российской Федерации, но ни в том, ни в другом случае это не оправдывает применения силы против населения, выразившего волю к автономии. Грузия в неменьшей степени, чем Россия, пользуясь выражением Ленина, является *"тюрьмой народов"*. Стремясь перебороть маленький народ силой, Саакашвили сделал в точности то же самое, в чем он обвиняет Россию, пишет британская **Daily Telegraph** и продолжает:

"Реакция России была слишком воинственной и слишком непропорциональной. Она как будто ждала такой возможности. На карту поставлено равновесие силы в регионе. Если Кремль в состоянии по сути дела аннексировать Южную Осетию, то что мешает ему поглотить и другие части бывшего СССР с русским населением? Быть может, теперь Россия объявит свое право защищать этнических русских в Балтийских государствах? Или потребует коридор в Калининград? Присоединения к себе пророссийски настроенных восточных областей Украины? Или формального объединения с Беларусью?"

Последствия

Даже если отбросить интриги Москвы, осетины не простят Грузии разрушения своих городов и деревень. Когда пыль осядет, политическая оппозиция в Грузии может вырасти в результате военного поражения Саакашвили. В разгар войны парламент сплотился вокруг национального флага, но если в результате перемирия все грузинские войска, да и грузины в целом, окажутся вынуждены покинуть Южную Осетию и Абхазию, Саакашвили могут призвать к ответу не только за потерю территорий, но и за утрату возможности вступить в НАТО.

Россия тоже заплатила свою цену. Военное вторжение на суверенную территорию соседнего государства потрясло весь регион, не в последнюю очередь Украину, которая "оставила за собой право" запретить российским кораблям возвращаться на свои базы в Севастополь. Это вновь открывает вопрос вокруг баз Черноморского флота в Крыму. Таково мнение влиятельной газеты **Guardian**.

Эскалация конфликта между Россией и Грузией вокруг Южной Осетии и выход боевых действий за границы непризнанной республики привели к принципиальному изменению позиции США и других стран Запада, пишет **"Коммерсант"**. Они не просто назвали действия Москвы *"опасными и неприемлемыми"*, но и пригрозили ей ухудшением отношений. В ответ Россия пообещала ужесточить свою позицию по другим, более важным для Запада вопросам. Это не только не сулит скорого прекращения боевых действий в Грузии, но и грозит серьезным охлаждением отношений России с Западом.

Взгляд из грузинской столицы

Российские боевые самолеты в грузинском небе, российские танки на грузинской земле — не удивительно, что почти все здесь называют Москву агрессором. Они считают, что их бывшие советские хозяева, сидящие в Кремле, снова пытаются жестоко подчинить себе своего маленького южного соседа и этим самым доказать, что Россия — по-прежнему главная сила в регионе.

Демонстранты, собравшиеся на одной из центральных площадей Тбилиси, зажгли сотни свечей таким образом, что те образовали слова **"Остановите Россию!"**. Один пожилой человек сказал корреспонденту Би-Би-Си, что поддерживает решение своего правительства отобрать Южную Осетию у сепаратистов — даже несмотря на то, что Россия жестко отреагировала на это, применив военную силу.

Всего несколько месяцев назад лидеры грузинской оппозиции называли президента Михаила Саакашвили преступником и убийцей, отказываясь признавать его легитимность как избранного лидера страны. Сейчас они временно забыли о всех своих разногласиях и сплотились вокруг Саакашвили и его правительства, объявившего, что страна находится в состоянии войны.

"Людям нравятся его жесткие заявления, и большинство теперь на его стороне, — говорит детский психолог Ана. — *Даже те, кто поддерживал оппозицию". "Это просто ад, это страшное несчастье, но мы должны сражаться до конца, потому что России надо преподать урок — она не может так вести себя в XXI веке. Даже если нам всем придется умереть",* — убеждена Ана.

О позиции России

Как заявил президент России Дмитрий Медведев, *"наши миротворцы и приданные им части осуществляют операцию по понуждению грузинской стороны к миру. На них также лежит ответственность по защите населения."*

Российский посол в ООН Виталий Чуркин ответил на огонь критики в адрес России со стороны США и Грузии в Совете безопасности.

Россию обвиняли в геноциде грузинского народа, в попытке стереть Грузию с лица земли и даже в том, что Михаил Саакашвили не смог дозвониться до Дмитрия Медведева, передает НТВ.

Виталий Чуркин, постоянный представитель РФ при ООН: *"Теперь по поводу возмущения постоянного представителя Грузии, что наш президент отказался разговаривать с президентом Грузии. Простите меня, а какой же приличный человек будет с ним сейчас разговаривать? После того, что мы годами объясняли ему — любая попытка военного решения конфликта будет самоубийственной для Грузии?*

Мы не допустим того, чтобы стерли с лица земли Южную Осетию и Абхазию. Причем говорилось это с первого — первого! — контакта президента Саакашвили с российским президентом и до последнего момента. И он уверял нас, как и публично международное сообщество, что у него и в мыслях нет применять силу против собственного народа".

США выразили поддержку Тбилиси

Вашингтон заявил о своей поддержке Грузии.

Президент США Джордж Буш заявил в интервью американскому каналу Эн-Би-Си-Спорт, что во время разговора с российским премьером Владимиром Путиным в Пекине твердо высказал ему свою позицию насчет *"непропорционального ответа"* России на действия Грузии в Южной Осетии.

"*Я выразил серьезную озабоченность непропорциональным ответом России и сказал, что мы осуждаем бомбардировки за пределами Южной Осетии"*, — заявил президент США.

Буш назвал насилие в регионе неприемлемым и призвал стороны вернуться к положению на 6 августа — то есть к ситуации до начала операции Тбилиси против юго-осетинских сепаратистов. Президент США Джордж Буш считает, что к разрешению конфликта Грузии и России должны подключиться международные посредники.

Накануне свою поддержку президенту Грузии Михаилу Саакашвили выразил вице-президент США Дик Чейни, заявив при этом, что *"российская агрессия не должна остаться без ответа" и ее продолжение имело бы "серьезные последствия для отношений между Россией и США".*

В телефонном разговоре с Михаилом Саакашвили Чейни выразил *"солидарность Соединенных Штатов с народом Грузии и ее демократически избранным правительством"*, сообщила пресс-секретарь американского вице-президента. США потребовали от России прекращения военных действий на Кавказе, сообщило агентство dpa.

Призыв Европейского Союза

Европейский Союз призвал Грузию и Россию *"безотлагательно прекратить боевые действия" в Южной Осетии и "вернуться к положению, предшествовавшему началу конфликта"*. Об этом говорится в заявлении, с которым выступила от имени Евросоюза председательствующая в нем Франция.

В документе выражена *"глубокая обеспокоенность в связи с жертвами и страданиями, выпавшими на долю населения, значительными разрушениями, растущим числом беженцев" в зоне конфликта. Страны ЕС готовы "участвовать в гуманитарной акции в поддержку населения"* пострадавших районов, сказано в заявлении.

Министр иностранных дел Франции Бернар Кушнер в интервью телеканалу France-2 заявил, что Урегулирование южноосетинского кризиса должно быть международным, с участием ООН и Евросоюза.

"Мы ответственны за то, что происходит в регионах, окружающих ЕС", — сказал Кушнер. Кушнер отметил, что Евросоюз активно участвует в урегулировании, и *"способен оказать помощь и в дальнейшем, став, возможно, гарантом мира"* на Кавказе.

Подготовил к печати Сергей ИВАНОВ.

КАЛЕЙДОСКОП

Ткань-невидимка

Американские ученые говорят, что приблизились к разработке материалов, которые смогут сделать человека невидимым.

Ученым из калифорнийского университета Беркли под руководством Сян Чжана удалось смоделировать покрывало для небольших объектов, которое не отражает свет, а заставляет его огибать эти объекты, делая их невидимыми.

Сжег два миллиона долларов

Глава федерального агентства Нигерии, занимавшегося разработкой нефтяных месторождений на юге страны, арестован, передает агентство Associated Press. Чиновника обвиняют в том, что он потратил несколько миллионов долларов на услуги черных магов.

Арестованный Сэм Идем заплатил около четырех миллионов долларов колдуну, который обещал навести порчу и убить другого государственного служащего, с тем чтобы выгодные контракты впоследствии перешли к Идему. Сообщается также, что Идем сжег два миллиона долларов в местной валюте на магической церемонии.

После того как магические ритуалы не сработали, Идем потребовал у колдуна возврата денег, однако тот отказал ему. Позже маг заявил полиции, что Идем должен ему не менее двух миллионов долларов.

Прыгнул на машину Папы Римского

Суд немецкого города Вальдсхут-Тинген приговорил к четырем годам условного заключения мужчину, который в 2007 году прыгнул в Ватикане на машину Папы Римского Бенедикта XVI, сообщает AFP. В июне прошлого года немец попытался вскочить на машину Бенедикта XVI (папамобиль), которая двигалась по площади Святого Петра в Риме во время традиционной встречи с верующими. Прыгну удалось прицепиться к задней части папамобиля, но охранники его оттуда стащили. Сам понтифик происходящего даже не заметил, однако двое телохранителей каким-то образом получили травмы.

Кто живет дольше всех?

Японки продолжают первенствовать в мире по продолжительности жизни уже 23 года подряд. Об этом сообщило национальное Министерство здравоохранения, труда и благосостояния.

По его данным, средняя продолжительность жизни японок в этом году составила 85,99 года. У мужчин этот показатель равнялся 79,19 года, и они сумели занять лишь третье место в мире, хотя в прошлом году были на второй ступеньке.

Вслед за японскими женщинами в мировом рейтинге также лидируют жительницы Гонконга (84,4 года) и француженки (84,1 года). Первое место по продолжительности жизни у мужчин принадлежит жителям Исландии (79,4), а второе — жителям Гонконга (79,3), передает ИТАР-ТАСС.

Погиб от пяти кексов

34-летний житель Великобритании Адам Дили погиб во время импровизированного соревнования по запиханию кексов в рот. Британец подавился, пытаясь съесть пять кексов за один раз, и впоследствии умер в больнице, сообщается на сайте This Is London.

Дили и его знакомые сидели в кафе Monkey в городе Суонси в Южном Уэльсе. Приятели британца стали дурачиться и устроили импровизированное соревнование, кто сможет засунуть в рот больше кексов. Одному из них удалось засунуть три, другому — четыре. Дили захотелось превзойти приятелей, и он с трудом уместил во рту пять кексов.

Впоследствии выяснилось, что кексы попали в дыхательные пути британца, и он стал задыхаться. Друзья Дили поняли, что происходит, лишь когда он потерял сознание. Британца пытались привести в чувства своими силами, однако ничего не получилось. Прибывшие на место происшествия медики также оказались бессильны.

ЧТО ТАМ, ЗА БУГОМ?

Польша и Германия — вместе на восток

Растущую активность Германии в Восточной Европе надо расценивать как шанс, а не угрозу. Польша должна поддерживать те тенденции в немецкой внешней политике, которые в наибольшей степени могут содействовать улучшению эффективности польско-немецких внешнеполитических инициатив, а также сформированию тандема лидеров восточного измерения европейской политики — пишет в опубликованной "Газетой выборчей" обширной аналитической статье директор Польского института международных дел Славомир Дембский. В статье под заголовком "Польша и Германия — вместе на Восток" польский политолог анализирует усилия с целью большей интеграции с Западом бывших республик Советского Союза — Украины, Беларуси, Молдовы, Грузии — усилия, предпринимаемые на протяжении последних лет Польшей и другими странами.

Армия станет профессиональной

Польское правительство приняло программу профессионализации Вооруженных сил. Как заявил премьер Дональд Туск, программой, которая должна быть завершена к 2010 году, предусмотрено сокращение личного состава Войска польского до 120 тыс. солдат и офицеров.

В ходе реорганизации польская армия будет полностью переведена на профессиональную основу. По мнению министра национальной обороны Богдана Клиха, к концу 2010 года Войско польское будет более эффективным и лучше, чем сегодня, подготовленным для выполнения задач на современном поле боя, а также для участия в международных операциях по поддержанию мира в горячих точках планеты.

Не желаете стать владельцем замка в Чехии?

По низкой цене можно купить сейчас в Чехии старинный замок или целое поместье с интересным историческим прошлым.

На продажу выставлено более 1600 поместий и 400 замков, сообщает Ceske Reality, специальное приложение к газете Prague Post, посвященное недвижимости. Интерес к недвижимости быстро растет, и число продаж за последний год увеличилось на 250 процентов.

По данным W.K.Holdings, единственного в стране агентства, занимающегося только продажей недвижимости с историческим прошлым, цены на нее не растут, и сейчас лучшее с 1995 года время ее покупать.

Те замки и поместья, у которых объявились законные владельцы, им большей частью уже возвращены по закону о реституции. Поэтому проблем с правом собственности возникать не должно. Кроме того, государственные и местные органы власти, заинтересованные в возрождении памятников старины для привлечения туристов, предлагают немалую помощь и налоговые послабления новым владельцам. Одним словом, замок или поместье могут стать в вашим домом, и вашим доходным бизнесом.

Два года назад поместье Бечвары, что в 10 километрах к западу от города Колин, купил Роберт Кодым, член знаменитой чешской рок-группы Lucie. Поместье — это три гектара земли, хозяйственные постройки, три огромных подземных склада, принадлежавших местному пивзаводу, и двухэтажный дом из 19 комнат и залов общей площадью 900 квадратных метров. Поместье было подарено австрийской императрицей Марией Терезией генералу Лаудону, прославившемуся победами над турками. По словам отца нового владельца Бечвары, поместье обошлось меньше стоимости семейной виллы в Праге.

Реконструкцию поместья финансирует семья Кодымов, Региональный фонд Центральной Богемии и Министерство культуры Чехии. По закону, государственные органы могут выделять до 40 процентов средств, необходимых для реконструкции.

У Кодымов большие планы. Они планируют открыть здесь концертный зал, а также организовать музей искусства и архитектуры XVIII века и краеведческий музей для региона Колин — Кутна Гора — Коуржим — Бечвары.

ПРАБЛЕМА

Выжыванне...

Маці васьмярых дзяцей атрымлівае 194 тысячы беларускіх рублёў пенсіі. Напэўна, у любой нармальнай краіне гэта палічылі б нацыянальнай ганьбай. Але, на жаль, толькі не ў Беларусі...

Ліст у рэдакцыю

"Паважаная рэдакцыя! Пішa вам Святлана Іванаўна Бабіч з вёскі Ляды Чэрвеньскага раёна. Можа быць, вы на старонках газеты ўздымеце наступную праблему: у нас у Беларусі, з аднаго боку, нізкая нараджальнасць і востра стаіць дэмаграфічная праблема, а з другога — дзяржава абыякава ставіцца да маці-гераіні, выплачваючы ёй мізэрную пенсію. У Марыны Станіславаўны Восіпавай 8 дзяцей. Яна разам з мужам выгадавала і працягвае іх выхоўваць. У старэйшага сына Восіпавых ужо ўласная сям'я. Яшчэ трое працуюць, а чацвёра малодшых вучацца, прычым трое з іх — у школе.

Калі Марыне Станіславаўне споўнілася 50 гадоў, яна, як шматдзетная маці, аформіла пенсію. І ёй налічылі пенсію... у 190 тысяч рублёў".

"Што можа быць лепей, чым даваць жыццё?"

Рэагуючы на ліст, карэспандэнт "Народнай волі" адправіўся ў сям'ю Восіпавых, з тым каб хаця б праверыць факты, выкладзеныя нашай чытачкай.

...Марына Станіславаўна разам з мужам Леанідам Уладзіміравічам і малодшымі дзецьмі жывуць у самай звычайнай кватэры ў сталічным спальным мікраараёне "Малінаўка". Візіту журналіста яны былі вельмі здзіўлены і ўсё ўгаворвалі аўтара гэтых радкоў "не разгалошваць інфармацыю".

Здавалася б, людзі просяць, і адмаўляць ім неяк няёмка, але з іншага боку факт існуе — шматдзетная маці атрымлівае капеечную пенсію. Праблему, безумоўна, трэба ўзнімаць, з тым каб у чарговы раз звярнуць увагу адказных за пенсіённае забеспячэнне чыноўнікаў. Бо нельга рабіць усё адначасова: і працаваць, і дзяцей нараджаць, і выхоўваць іх. Калі ў тваёй хаце дзесяць чалавек і ўсе накормлены, напоены, дагледжаны, адпраўлены ў школу і дзіцячы садок — гэта ўжо само па сабе вялікая праца.

На прыкладзе шматдзетнай сям'і Восіпавых гэта бачна як нельга лепш, таму, паважаная Марына Станіславаўна, прабачце... Будзем абапірацца толькі на факты.

"Канкрэтнай спецыяльнасці ў мяне не было, — гаворыць Марына Станіславаўна. — Усё жыццё я працавала на нейкіх падсобных работах — была і дворнікам, і вартаўніком... Ды і дзе ж мне было працаваць, калі я ў 18 гадоў выйшла замуж і, пакуль магла, нараджала. Што можа быць лепей, чым даваць жыццё?"

Сапраўды, што можа быць лепей? Але, даўшы жыццё дзіцяці, маці і бацька, калі з жыццёвымі прынцыпамі ў іх усё ў парадку, перш-наперш нясуць адказнасць за сваіх нашчадкаў. Дзяцей яшчэ трэба годна выхаваць, паставіць на ногі, падрыхтаваць да дарослага жыцця. Хіба ж гэта не цяжкая штодзённая праца?

...Аб тым, што дзяцей у сям'і будзе шмат, Марына Станіславаўна і Леанід Уладзіміравіч ведалі заўжды. "Жыццё даецца чалавеку Богам, і ніхто не мае права яго забіраць. Нам Бог даў васьмярых дзетак. І сэнс нашага жыцця — толькі ў іх", — разам гавораць яны.

Пенсія маці-гераіні — 194 тысячы рублёў

Як шматдзетная маці Марына Станіславаўна мела права сысці на пенсію, дасягнуўшы пяцідзесяцігадовага ўзросту. Што яна і зрабіла.

Агульны працоўны стаж у Марыны Станіславаўны — 18 гадоў. Праўда, "за даўнасцю гадоў тры гады стажу "зніклі" — не знайшлося дакументаў, каб іх пацвердзіць, таму пенсію налічылі толькі за 15 працоўных гадоў.

У ліпені бягучага года, праз год пасля выхаду на пенсію, Марына Восіпава атрымала 194 тысячы беларускіх рублёў. А спачатку атрымлівала і таго менш — недзе 180 тысяч. Атрымліваецца, што пры шалёным росце коштаў на ўсё дзяржава "накінула" шматдзетнай маці ажно 14.000 рублёў. "Увогуле, я на жыццё не скарджуся і не хацела б, каб вы ўздымалі гэтую праблему... Так, пенсія ў мяне маленькая, але што зробіш, колькі зарабіла... Калі так палічыла дзяржава, то, напэўна, так і правільна..." — гаворыць яна.

Ці правільна тое, што за сваю пенсію Марына Станіславаўна ледзьве можа аплаціць камунальныя плацяжы і кватэрны тэлефон, — пытанне рытарычнае...

Сказаць, што дзяржава зусім не прымае ніякага ўдзелу ў жыцці шматдзетных сем'яў, будзе няправільна. Па-першае, у свой час старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў узнагародзіў Марыну Восіпаву ордэнам як маці-гераіню. Па-другое, жанчына як шматдзетная маці карыстаецца бясплатным праездам у грамадскім транспарце. А па-трэцяе, і гэта самае істотнае, дзяржава пагашае за Восіпавых крэдыт, які быў узяты пад паляпшэнне жыллёвых умоў. "У сувязі з тым, што ў нас вялікая сям'я, дзяржава выдзеліла нам кватэру ў Сухараве, — гаворыць Марына Станіславаўна. — Крэдыт тэрмінам на 40 гадоў, за яго разлічваецца дзяржава. Між іншым, месячны плацёж па крэдыце амаль роўны памеру маёй пенсіі..."

Жанчына нават не задаецца пытаннем, чаму яе шматдзетная сям'я не мела права на бясплатную дзяржаўную кватэру. Звыкласся разлічваць толькі на сябе...

Канечне, Марыне Станіславаўне, як і многім беларускім пенсіянерам, хацелася б, каб памер яе пенсіі хоць трохі павялічыўся. Праўда, пры гэтым яна па-філасофску дадае: "Ну, прыбавяць мне пенсію, будуць плаціць, скажам, 300 тысяч рублёў... Гэта, канечне, палепшыць наша сямейнае становішча, але неістотна. Вы не падумайце, што я скарджуся. Я разумею, што ў дзяржавы шмат іншага клопату, што ёсць людзі, якім яшчэ горш, чым нам. Ёсць інваліды, якім грошы таксама патрэбныя. У гэтай сітуацыі шкада толькі, што бацькоўская праца па выхаванні дзяцей так нізка цэніцца..."

Пасля наведвання сям'і Восіпавых я падумаў пра тое, што гэтым людзям, якія ўзгадавалі васьмярых дзяцей, пры гэтым ні на што не скардзячыся, разлічваючы ў першую чаргу толькі на сябе, дзяржава павінна пакланіцца ў ногі. Падумалася таксама і пра дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, якія, седзячы ў парламенце, пра сябе не забыліся. А вось пра такіх сціплых людзей, як Марына Станіславаўна, і думаць не хочуць. Ну не павінна быць так, што пенсіі маці-гераіні хапае толькі на "камуналку"! Затое "народныя выбраннікі", сыходзячы на "заслужаны адпачынак", з'яўляюцца ледзьве не самымі забяспечанымі пенсіянерамі ў Беларусі...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

"Несовместимый проступок" судьи в Березе привел к его отстранению от должности

На днях А.Лукашенко подписал указ об освобождении от должности председателя и судьи суда Березовского района Леонида Трухановича "за совершение проступка, несовместимого с государственной службой".

"Народная воля" попыталась выяснить, за что именно уволили судью Трухановича.

Председатель суда Брестской области **Тамара Сучок** ответила: *"Вопросами назначения и увольнения занимается не областной суд, а главное управление юстиции облисполкома".* Первый заместитель начальника главного управления юстиции облисполкома **Антон Гущин** сообщил "Народной воле", что вопрос отстранения от должности Л.Трухановича действительно инициирован главным управлением юстиции, но им занимался сам начальник **Сергей Калиновский**, который сейчас в отпуске. *"Неэтично будет за него комментировать это отстранение. Подождите его возвращения из отпуска. И вообще, зачем "добивать" человека? — он и так уже пострадал".*

Тем не менее из конфиденциальных источников "Народной воле" стало известно, что березовский судья до своего отстранения уже имел нелицеприятные беседы с начальником главного управления юстиции по поводу "зеленого змия" и "беспощадной борьбы" с алкоголем. Однако профилактические беседы не дали эффекта: судья продолжал, как говорят, закладывать за воротник, за что получил взыскание. Говорят, последней каплей, переполнившей чашу терпения, стало то, что председателя районного суда застали в нетрезвом виде на рабочем месте. В конце концов главное управление юстиции Брестского облисполкома выступило с инициативой — отстранить председателя суда от должности.

Александр КОВАЛЬЧУК.

Брест.

РЭГІЁН

На Нёман дэсантавалася хуткая археалагічная дапамога

Яна спяшаецца адшукаць скарбы мінуўшчыны, схаваныя пад зямлёй. Бо праз два гады там усё будзе затоплена вадой.

Археалагічная экспедыцыя, арганізаваная Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі разам са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кінула якар на берагах Нёмана. Праз два гады яны будуць схаваны вадасховішчам Гродзенскай ГРЭС. Таму яшчэ ў 2003 годзе правялі археалагічную разведку і вызначылі 33 пляцоўкі, якія мэтазгодна было даследаваць. Іншымі словамі, правесці раскопы, каб пацвердзіць або абвергнуць традыцыйнае меркаванне наконт засялення людзьмі Прынямоння.

Дарэчы, спецыялісты ўсіх напрамкаў дагэтуль спрачаюцца, ці варта перагароджваць раку, руйнаваць яе экалагічны баланс дзеля 3% электраэнергіі, якая выпрацоўваецца ў Беларусі. На сённяшні час засталіся два пункты гледжання на будаўніцтва: эколагаў і энергетыкаў. Першыя па-ранейшаму непрыступныя ў сцвярджэнні, што рака стане іншай, да таго ж зменіцца ў горшы бок і навакольнае жыццё на ёй. Энергетыкі пра захаванасць ракі ўспамінаюць менш — вылучаюць найперш ідэю энергетычнай бяспекі краіны, забываючыся, што акрамя цяпла чалавеку трэба і чыстае паветра.

А археолагі робяць сваю справу і хочуць як мага хутчэй даследаваць тыя помнікі, што апынуцца пад вадой і назаўсёды будуць страчаны для чалавецтва. Іх шмат, і ўсе яны карысныя для навукі. Гаворыць Віталь Сідарэвіч, адзін з кіраўнікоў раскопаў, супрацоўнік гістарычнага факультэта БДУ:

— Гэтае месца выключнае не толькі для беларускай, але і для еўрапейскай археалогіі. Тут знаходзіцца найкаштоўнейшы помнік "Кавальцы-4", які датуецца старажытным часам і які адкрыў Віктар Сцяпанавіч Абухоўскі. Гэта менавіта ён разам са студэнтамі знайшоў гэты старажытны слой са знаходкамі — косткамі мамантa, каня, аленя, сусліка. А ў гэтым годзе знайшлі пацеркі, закамянелы бісер. І гэтыя археалагічныя артэфакты, а іх ужо больш за 100, мы можам датаваць 13—17-тысячнай даўніной, самай старажытнай на Панямонні, і меркаваць нейкім чынам аб узнікненні жыцця ў гэтым куточку Беларусі.

Дык вось, на думку Віталя Сідарэвіча, на той час клімат адрозніваўся ад сучаснага: лясоў не было, а былі тундра-стэпавыя абшары з мамантамі і калматымі насарогамі. Людзі больш палявалі на аленяў, і лад жыцця нагадваў звычаі эскімосаў. Насельнікі не ўмелі яшчэ рабіць кераміку, а ўсе прылады былі з крэменю, і пакінулі яны гэты край у сувязі з чарговым пахаладаннем. Так што мы, сучасныя жыхары Прынямоння, не належым да тых першых пасяленцаў краю.

Пагаджаецца з ім і Ігар Язэпенка, загадчык сектара навуковых археалагічных фондаў НАН Беларусі: ён мяркуе, што гэтая стаянка адносіцца да кундайскай культуры, якая была характэрна для паселішчаў у Эстоніі.

Археолагі — як мастакі. З дапамогай памазкоў і невялічкіх скрабкоў яны малююць карціну мінуўшчыны. Асцярожна, па міліметры, угрызаюцца ў зямныя пласты, каб узбагаціць навуку ўнікальнымі археалагічнымі артэфактамі. Праца настолькі карпатлівая, што ўся зямля з археалагічных помнікаў дадаткова прамываецца водамі Нёмана. Але гэта дало магчымасць дакапацца да гісторыі Прынямоння шматтысячнай даўніны і меркаваць аб тым, якім яно было ў той час.

Вядома, што кожны археолаг марыць аб унікальных знаходках. Не выключэнне і студэнты БДУ, якія праходзяць тут сваю навуковую практыку. Дарэчы, дапамагаюць і студэнты іншых, нават замежных ВНУ. Іх прыезд сюды не абавязковы, гэта ўласнае жаданне кожнага. Напрыклад, дзяўчына з Каўнаса прыехала не толькі дакапацца да глыбінь мінулага, але і пашырыць свой кругагляд, пазнаёміцца з беларускай моладдзю.

Прыязджаюць на раскопы і студэнты старэйшых курсаў, якія былі тут раней. Яны так звыкліся з лагерным жыццём, што не могуць уявіць канікулы ў гарадской кватэры ці дзе-небудзь на ўзбярэжжы Чорнага мора альбо Турцыі. Яны ўжо "інфіцыраваны" археалогіяй, як і тыя першакурснікі, што шчыруюць у глыбіні раскопаў.

На жаль, усё, што задумана, ажыццявіць не ўдасца з-за адсутнасці належнага фінансавання. Канешне, каб былі грошы, сюды б прыехала значна больш студэнтаў і на больш доўгі тэрмін. Аднак гэта іх не засмучае, і яны з задавальненнем ездзяць у такія палявыя лагеры, каб потым на ўсё жыццё быць улюбёнымі ў археалогію.

І ўсё ж зроблена вялікая праца, а археалагічныя помнікі "Кавальцы-2", "Кавальцы-4" увойдуць ва ўсе падручнікі. Адметнасць іх і ў тым, што тут загартоўвалася новае пакаленне беларускіх археолагаў. І яшчэ ў тым, што пры затапленні рэчышча Нёмана яны знікнуць. Назаўсёды.

Алесь ВАСІЛЬКОЎ.

www.bulletinonline.org

РЭГІЁН

Дзеля «Дажынак» гісторыі не шкада

Гэта так званая карчма — унікальны помнік драўлянага дойлідства XIX стагоддзя.

Такіх старажытных аб'ектаў, дзе падсілкоўваліся і выпівалі нашы продкі, у Беларусі па пальцах пералічыць. Размешчана карчма на вуліцы Пралетарскай. Тут знаходзіўся да гэтай пары Дом рамёстваў. У ліпені мастакам і рамеснікам прапанавалі пакінуць памяшканне. Мясцовым краязнаўцам стала вядома, што карчму збіраюцца знесці.

У абарону унікальнага помніка дойлідства краязнаўцамі сабрана звыш за 50 подпісаў аршанцаў, пісьмы і адпаведныя дакументы разасланы ў розныя інстанцыі. Яны нагадваюць уладам, што яшчэ ў 1991—1992 гадах у гарадскі аддзел культуры паступілі дакументы аб унікальнасці будынка. Быў і праект яго рэстаўрацыі за подпісам доктара гістарычных навук, дырэктара Інстытута этнаграфіі і фальклору НАН Аляксандра Лакоткі. Але нейкім чынам тыя дакументы зніклі, ці чыноўнікі ад культуры не могуць іх знайсці. Ці не хочуць?

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Бизнесмена и экономиста Михаила Шавельзона будут судить

Дело почетного вице-президента Белорусского союза предпринимателей Михаила Шавельзона 28 июля передано в суд Фрунзенского района Минска.



Напомним, что новость о задержании **Михаила Шавельзона** и литовского бизнесмена **Гинтаса Зегериса** появилась в начале июня. Как уже сообщалось, гражданин Литвы подозревается в посредничестве при даче взятки. Литовская пресса писала, что Зегерис работал в Беларуси более десяти лет в области деревообработки и имел здесь вид на жительство.

Как стало известно "Народной воле", Михаил Шавельзон и Гинтас Зегерис обвиняются по части второй статьи 431 и части 4 статьи 209 Уголовного кодекса Республики Беларусь — *"Дача взятки повторно, либо за заведомо незаконное действие (бездействие), либо в крупном размере"* и *"Мошенничество, совершенное организованной группой либо в особо крупном размере".*

По делу проходит также некто **Павел Николаевич Гончар** — кроме двух вышеуказанных статей ему инкриминируется также и вторая часть статьи 295 — *"Незаконные изготовление, приобретение, передача во владение, сбыт, хранение, перевозка, пересылка или ношение огнестрельного оружия, боеприпасов, взрывчатых веществ, взрывных устройств".*

В Белорусском союзе предпринимателей знают, что Михаил Шавельзон находится под стражей: недавно в БСП за характеристикой на мужа обратилась супруга Михаила Исааковича. Однако с журналистами она общаться не желает. *"Михаила Исааковича вы услышать не можете,* — сказала по телефону жена Михаила Шавельзона. — *Могу точно сказать, что он не эмигрировал. А тему его задержания мне не очень хочется обсуждать с незнакомыми людьми... И вообще, какое дело журналистам до того, где он находится? Его нет и все".*

Председатель Белорусского союза предпринимателей **Александр Калинин** говорит, что он даже не знает, кто из адвокатов защищает Шавельзона.

"У нас нет никакой информации о Михаиле Шавельзоне, — сказал Александр Федотович "Народной воле". — *Мы действительно по просьбе жены дали ему характеристику — естественно, положительную, потому что он много хорошего сделал для экономики страны. Кто его защищает, тоже не известно: супруга нам ничего не говорила. Остается надеяться, что Шавельзон вообще ни при чем..."*

Марина КОКТЫШ.

НУ І НУ!

У продажы з'явіліся марынаваныя чэрві

Калі старшыня РГА "Перспектыва" Анатоль Шумчанка купіў у адным са сталічных гіпермаркетаў банку марынаваных маслякоў, то знайшоў там яшчэ і... чарвей. Так бы мовіць, "мяса" да грыбочкаў.

"На баначцы было напісана, што маслякі з'яўляюцца цудоўнай закускай і ўпрыгожаннем стала, — распавядае Анатоль Шумчанка. — Вытворца гэтай "прыгажосці" — Кітай. Аднак калі дома я адкрыў банку і парэзаў грыбы, то быў проста ў шокавым стане! Маслякі былі разам з белымі чарвямі. Я аднёс грыбы з "прыдаткам" назад у гіпермаркет, там "пытанне разгледзелі" ў вельмі прыстойнай форме. Не адмаўляліся, што гэта прадукт з іх магазіна, паставіліся ўважліва... Хоць адна маладая супрацоўніца і спрабавала запэўніць мяне, што "гэта хутчэй за ўсё не чэрві, а спецыі". Праўда, ніхто гэтыя самыя "спецыі" пакаштаваць не захацеў. Як не захацелі паспрабаваць "далікатэс" і ў Цэнтры гігіены і эпідэміялогіі Маскоўскага раёна Мінска, куды я аднёс грыбы на аналіз. Бо там мяне ўжо паспрабавалі пераканаць, што "марынаваныя чэрві — гэта не смяротна і ніхто не памёр бы нават, калі б іх і з'еў". Тым не менш на аналіз грыбы браць не захацелі. Маўляў, ёсць інструкцыя, згодна з якой пасля звароту грамадзян з такімі скаргамі супрацоўнікі вышэйназванай установы могуць толькі прыехаць у той магазін, дзе быў куплены тавар, узяць на пробу банку з партыі тавара і праверыць. Але тут у мяне ўзнікае пытанне: навошта мне праверка іншай банкі грыбоў, калі я еў з канкрэтнай? Як жа мае правы як спажыўца? Да таго ж я са здзіўленнем даведаўся, што, аказваецца, ёсць і нейкая "дапушчальная норма ўтрымання чарвякоў".

— Мы насамрэч па такіх зваротах правяраем аб'ект гандлю, дзе купляўся тавар, — паведаміла ў гутарцы з карэспандэнтам "Народнай волі" супрацоўніца Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Вольга Цімашэнка. — Калі ёсць неабходнасць, то бяром на аналіз прадукт. У адпаведнасці са стандартам і робім пробы. У нас, дарэчы, ёсць лабараторыя, дзе за грошы грамадзяніну могуць правесці даследаванні тавара. Але лабараторыя не ва ўсіх галінах акрэдытавана. Напрыклад, наша паразіталагічная лабараторыя даследуе толькі саміх чарвякоў. Больш таго — чэрві павінны быць у жывым стане. Але не ў кансерваваным... А ўвогуле, за якасць прадуктаў адказвае Дзяржстандарт".

"Калі зачынялі кіёскі, на прадпрымальнікаў лілі бруд з-за быццам бы нізкай якасці тавараў, — дадае Анатоль Шумчанка. — Вось вам адваротны прыклад. У салідным магазіне — і такі вось тавар. Сучасная форма гандлю — гэта не вялікія магазіны, а адказны падыход да справы і здаровая канкурэнцыя. Як прадстаўнікоў вялікага, так і малога бізнесу".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЧУЛІ?

У Беларусі будзе пагранічны інстытут

У Беларусі плануецца стварыць пагранічны інстытут. Ён можа быць створаны на базе факультэта пагранічных войскаў Ваеннай акадэміі.

Як паведаміў начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Дзяржаўнага пагранічнага камітэта палкоўнік Юрый Фёдараў, для курсантаў гэтай ВНУ намечана стварыць на базе Смаргонскага вучэбнага цэнтра (Гродзенская вобласць) палявы вучэбны цэнтр. Тут яны будуць праходзіць стажыроўку на розных пасадах, у тым ліку начальніка пагранічнай заставы, намесніка начальніка погранзаставы.

Пограничников переоденут

Госпогранкомитет Беларуси планирует ввести новую форму одежды для военнослужащих на пунктах пропуска.

Об этом сообщил заместитель председателя Госпогранкомитета Евгений Комарницкий.

Так, например, предлагается, чтобы на пунктах пропуска военнослужащие несли службу в полевой форме и в туфлях. Кроме того, рассматривается возможность ввести для офицеров и прапорщиков камуфлированные рубашки с коротким рукавом. По мнению зампредседателя Госпогранкомитета, это создаст условия для комфортного несения службы, что в свою очередь должно повысить и ее результаты.

Говоря о военной форме для рядового состава органов погранслужбы, Евгений Комарницкий рассказал, что этому вопросу уделяется повышенное внимание. Госпогранкомитет полностью перешел на обеспечение военнослужащих беретами вместо кепок, а новое специальное хлопчатобумажное обмундирование не только более удобно и функционально, но и выдерживает многократные стирки без потери изначального цвета.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Жывы нябожчык

Калі вядомы праваабаронца Алег Волчак паведаміў, што пракуратура выявіла асобу, якая пагражала яму гэтай зімой фізічнай расправай, адразу паверылася ў прафесіяналізм нашых праваахоўных органаў. Няхай сабе і праз паўгода, але злачынца быў знойдзены і панясе пакаранне. Аднак высветлілася, што Волчаку пагражаў чалавек, памерлы два гады таму...

Нагадаем, напярэдадні 15 лютага — Дня вываду войск з Афганістана — Алегу Волчаку на электронную скрыню прыйшлі лісты з пагрозамі. У іх былога "афганца" Волчака настойліва "прасілі" не прыходзіць на Востраў слёз у Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. "Аўтары лістоў у сваіх пасланнях мне пагражалі, — гаварыў тады Волчак. — Іначай як расцэньваць вось гэты пасаж ад "воіна-дэсантніка 103-й дывізіі": *"Ты еще про Остров слез заикаешься? Ты попробуй приди 15-го на наш Остров, тогда мы разберемся, кто откуда призывался, где кто служил и кто за что в ответе. Осталось только в харю тебя узнать".*

Пасля гэтага Волчак звярнуўся ў пракуратуру з заявай, у якой прасіў устанавіць чалавека ці людзей, якія яму пагражалі. "Я чакаў любога адмоўнага адказу, — прызнаецца Алег. — Але тое, што было напісана ў адказе па факце пагроз на мой адрас, вельмі здзівіла. Кампетэнтныя спецыялісты знайшлі таго, каму належыць электронная скрыня. Аказалася, што яна зарэгістравана на мужчыну, які памёр на пачатку 2006 года. З этычных меркаванняў я не буду называць ягонае прозвішча, каб лішні раз не турбаваць сваякоў. Іначай як дзікунствам гэта назваць нельга!"

Са слоў Волчака лісты з пагрозамі — справа рук сапраўдных прафесіяналаў: "Справа ў тым, што даслаць ліст на гэтую скрыню немагчыма тэхнічна, з яе можна толькі адправіць пасланне. Зразумела, што для таго, каб прымусіць скрыню працаваць у адным напрамку, трэба быць неблагім спецыялістам. Я не выключаю, што такія спецыялісты працуюць у беларускіх спецслужбах".

Як мяркуе Волчак, справу, звязаную з пагрозамі, было вырашана "замяць": "Я проста ўпэўнены, што калі б адказныя за гэта асобы хацелі знайсці "ананіма", то яны б зрабілі гэта, — гаворыць ён. — Чаго вартая аператыўнасць, з якой праваахоўнымі органамі быў "вылічаны" чалавек, які напісаў на адным з інтэрнэт-форумаў аб магчымасці выбуху ў Беларусі..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ВІНШУЕМ!

Віктар МАНАЕЎ: «У 50 гадоў адчуваю сябе лепш, чым у 20...»

Днямі заслужаны артыст Беларусі Віктар Манаеў адсвяткаваў сваё 50-годдзе.

Юбіляр расказаў "Народнай волі", што адзначыў дзень нараджэння ў кафэ побач з Купалаўскім тэатрам разам з самымі блізкімі і роднымі. Распавядаць аб падарунках Віктар Сяргеевіч палічыў нецікавым, але з задавальненнем падзяліўся сакрэтамі добрага самаадчування.

"Я не адчуваю такой выразнай мяжы, быццам учора мне было яшчэ 49 гадоў, а сёння 50, і нешта кардынальна змянілася, — *адзначыў Віктар Сяргеевіч.* — Стан залежыць не ад таго, колькі чалавеку гадоў, а ад таго, як ён

жыве, што думае, чаго жадае, моліцца ён або не. Гэта як з аўтамабілем: прытрымліваешся правілаў дарожнага руху — паедзеш далей, не прытрымліваешся — можаш у аварыю трапіць. І нумар на бамперы машыны тут ні пры чым..."

Юбіляр прызнаўся, што зараз адчувае сябе нават лепш, чым у 20 гадоў.

"У маладосці было шмат глупстваў, — *растлумачыў Віктар Сяргеевіч.* — Сёння імкнуся рабіць менш дурасцяў. Таму што ўжо няма часу на гэта — чалавечы век не такі вялікі..."

Валерыя ЕСІНА.

Мікалай ПІНІГІН, рэжысёр: «Манаеў — геніяльны артыст»

"Віктар Манаеў — геніяльны артыст. Калі ў рэжысёра ёсць такі артыст, а мы знаёмыя вельмі даўно, працуем разам у розных спектаклях, то я думаю, што гэта — цуд. Гэта не чалавек — гэта цуд. Гэта не артыст — гэта цуд. У ім ёсць усё, што я люблю ў артыстах. З аднаго боку — ён блазан, а з другога — інтэлектуал. У яго вельмі чуллівая душа. Ён — не чалавек, ён — інструмент, вельмі тонкі інструмент для рэжысёра".

З інтэрв'ю Радыё Свабода.

ЮБІЛЕЙ

Пракапцоў не абяцае спакою Міністэрству культуры...

8 жніўня дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў адзначаў юбілей. І не просты, а двайны: 55-годдзе з дня нараджэння і 10-годдзе дырэктарскай дзейнасці.

Роўна ў 8 гадзін 8 хвілін раніцы 8 жніўня адкрылася выстава Уладзіміра Іванавіча "Мой час", на якой прадстаўлены 8 твораў аўтара, створаныя за апошнія 8 гадоў.

Разам з тым музей адчыніў свае дзверы для ўсіх жадаючых павіншаваць юбіляра. А такіх было значна больш, чым афіцыйна запрошаных 88 гасцей. Нягледзячы на ранні час, людзі стаялі літаральна ў дзвярах музея.

Міністр замежных спраў Беларусі **Сяргей Мартынаў** уручыў юбіляру ганаровую грамату Міністэрства замежных спраў.

"8 жніўня ў свеце адбыліся дзве важныя падзеі: адна — юбілей Уладзіміра Іванавіча, а другая — адкрыццё Алімпіяды ў Пекіне, — жартаваў Сяргей Мартынаў. — *Прычым апошнюю мы апярэдзілі. Жадаю Уладзіміру Іванавічу, каб ён апярэджваў час і далей — як жывапісец і як дырэктар найважнейшага ў краіне музея..."*

Чыноўнікі завуць Пракапцова "двойчы ленінцам" — з-за таго, што Нацыянальны музей знаходзіцца на вуліцы Леніна, да таго ж у Ленінскім раёне. Таму лагічным было ўручэнне яшчэ адной ганаровай граматы — ад адміністрацыі Ленінскага раёна.

Ад імя ўсіх музейшчыкаў краіны юбіляра павіншавала дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея імя Якуба Коласа **Зінаіда Камароўская.**

"Усе музейшчыкі рады, што ў нашай кагорце такая асоба, як Уладзімір Іванавіч, — адзначыла Камароўская. — *Мы жадаем, каб у свой наступны 60-гадовы юбілей ён стаў першым беларускім музейшчыкам, зорка якога будзе закладзена ў Маскве".*

Асаблівую ўвагу выступоўцы надавалі віншаванням маці Уладзіміра Пракапцова.

"У прызначэнні Уладзіміра Іванавіча на пасаду дырэктара Нацыянальнага музея памылкі і быць не магло, — сказаў намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца. — *Гэты чалавек знаходзіцца на абсалютна сваім месцы. Ён надае новае жыццё і новае дыханне гэтай установе...*

Усе нашы заслугі, у тым ліку Уладзіміра Іванавіча, належаць нашым бацькам. Таму хачу віншаваць маці Уладзіміра Пракапцова!"

Уладзімір Іванавіч жартаваў, што будзе рады запрасіць усіх на свой 88-гадовы дзень нараджэння. І паабяцаў, што пакуль ён знаходзіцца на пасадзе дырэктара музея, не дасць спакою ні Міністэрству культуры, ні наведвальнікам — сваімі праектамі і новымі ідэямі.

"Час" Уладзіміра Пракапцова скончыцца ўжо ў гэтыя выхадныя — выстава працуе ўсяго 8 дзён, 8 гадзін і 8 хвілін...

Вольга ПРУДНІКАВА.

ШОУ-БИЗНЕС

Ирина ДОРОФЕЕВА: «Со мной никто не советовался...»

Молодая белорусская певица Анна Шаркунова на протяжении всей Олимпиады будет жить в Олимпийской деревне.

Вместе с Анной поддерживать белорусских спортсменов отправились также **Василий Раинчик,** девушки из ансамбля **"Верасы"**, **Виктория Алешко** и **Жанет**.

Зачем на Олимпиаде "звездный десант"? И как попадают в Пекин?

Были учтены пожелания спортсменов?

Артисты впервые включены в состав белорусской олимпийской делегации.

"Не знаю, кто конкретно принимал решение о том, кого из артистов отправить в Пекин, — сказал "Народной воле" продюсер Анны Шаркуновой **Владимир Кубышкин**. — *Но мне очень приятно, что Аню посчитали желанной и достойной гостьей на Олимпиаде. Недавно в интернете было обсуждение на тему, кого из звезд наши спортсмены хотели бы видеть в Пекине. И Аня Шаркунова была там одним из лидеров голосования. Так что я думаю, тут сработали естественные механизмы — были учтены пожелания именно тех, для кого артисты туда и поехали".*

"Это только плюс..."

Трехкратный олимпийский чемпион **Владимир Парфенович** считает, что ничего странного в присутствии неспортивной части белорусских знаменитостей на Олимпиаде нет.

"Это только плюс, если артисты снимают стресс спортсменам, — отметил Владимир Парфенович. — *Они ведь приезжают не просто поболеть — дают концерты, всячески развлекают олимпийцев... Для самих артистов такая поездка тоже хороша. Они не так много гастролируют по заграницам. А тут — возможность побывать в другой стране,*

отдохнуть. К тому же, думаю, оплачивается это неплохо".

Дорофеевой не предложили слетать в Пекин

Заслуженная артистка Беларуси **Ирина Дорофеева** поделилась с "Народной волей" воспоминаниями о своем опыте поддержки белорусских спортсменов за рубежом.

"В свое время приезжала на чемпионат мира по биатлону, — рассказала певица. — *Надеюсь, в том, что тогда вся наша команда вошла в тридцатку лучших спортсменов мира, есть и моя заслуга... Помню, как мы все вместе пели мои песни, какие у них были счастливые лица. Присутствие частички своей родины за рубежом очень важно.*

Когда от страны едет делегация, то в ней должны присутствовать и люди, представляющие белорусскую культуру. Концерты, какие-то акции, общение в таком окружении вдохновляют спортсменов..."

Однако в этот раз даже о том, кого из артистов отправили вдохновлять белорусскую команду, Ирина узнала от "Народной воли".

"Честно говоря, мне не предлагали поехать в Пекин, — призналась она. — *Но, с другой стороны, у меня сейчас идет ежегодный тур по Беларуси. Поэтому даже при всем желании я не смогла бы уехать.*

Со мной никто не советовался, кого отправить в Пекин из наших звезд эстрады. Я даже не знаю, кто отправлял, как и кто точно поехал. Надеюсь те, кого отправили, справятся с задачей поддержания боевого духа наших спортсменов".

"По просьбе главы государства..."

В управлении искусств Министерства культуры "Народной воле" сообщили, что хоть они и курируют белорусских артистов, но отправкой на Олимпиаду не занимались.

"Мы этим не занимались, — заявил заместитель начальника управления искусств Министерства культуры **Олег Галкин**. — *Не знаю, кто это организовывал, но точно не наше управление. Я впервые слышу, кто поехал... Мы курируем этих исполнителей на наших, белорусских мероприятиях, а кто их вывозит за границу — не знаем..."*

Кстати, на днях вопросом формирования делегации артистов на Олимпиаду задалось и **"Еврорадио"**. Сотрудник Молодежного театра эстрады (фамилия не называется) рассказал журналистам "Еврорадио", что артистов на Олимпиаду отбирал **А.Лукашенко**: *"Это по просьбе главы государства".*

Валерия ЕСИНА.

Новы тэатральны сезон: што, дзе, калі?

Літаральна праз некалькі тыдняў пачынаецца новы тэатральны сезон. "Народная воля" высветліла, якія праблемы хвалююць сёння тэатральны люд і якія прэм'еры нельга прапусціць.

Хто піша п'есу пра Быкава?

3 верасня Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы запрашае на "Паўлінку".

Новы спектакль "Ядвіга" па п'есе **Аляксея Дударава** ў пастаноўцы **Валерыя Анісенкі** быў прэзентаваны ў ліпені ў тэставым варыянце. Асноўная прэм'ера яго адбудзецца ў новым сезоне — 4 і 5 верасня.

Увосень Купалаўскі пачне працаваць над беларуска-расійскім праектам — чэхаўскім "Вяселлем".

Плануецца, што да 65-годдзя вызвалення Беларусі ў Купалаўскім адбудзецца прэм'ера спектакля, прысвечанага жыццю і творчасці Васіля Быкава пад умоўнай назвай "Вайна Быкава". Як сцвярджае мастацкі кіраўнік Купалаўскага **Валерый Раеўскі** (*на здымку*), п'еса пішацца. Аднак імя драматурга, які над ёй працуе, трымаецца ў велізарным сакрэце.

"Мы не называем аўтара, таму што ён будзе ўдзельнічаць у



драматургічным конкурсе, прысвечаным 65-годдзю вызвалення Беларусі, — распавядае кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі Тэатра імя Янкі Купалы **Вадзім Дапкюнас**. — *П'еса пішацца ў супрацоўніцтве з літаратурна-драматычнай часткай тэатра і асабіста Валерыем Раеўскім, які будзе рэжысёрам-пастаноўшчыкам гэтага спектакля".*

Рэжысёр нацыянальнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы **Уладзімір Савіцкі** зараз працуе над пастаноўкай "Фаўста" Гётэ. Гэты спектакль тэатр плануе зрабіць у супрацоўніцтве з Інстытутам Гётэ ў Беларусі. Магчыма, будуць запрошаны нямецкія кансультанты і мастакі.

А пасля сезона 2008—2009 года Купалаўскі тэатр закрываецца на рэканструкцыю.

"Адыгрываем сезон і ў сярэдзіне 2009 года пачынаем рэканструкцыю, — кажа Вадзім Дапкюнас. — *Дзе і як будзем працаваць — стане вядома бліжэй да восені".*

Фантомнае ноў-хаў

5 верасня прэм'ерай мюзікла адкрыецца Дзяржаўны музычны тэатр Беларусі.

"Нас чакае прэм'ера па творы "Гіпербалоід інжынера Гарына" — "Рускі фантом", — анансуе намеснік дырэктара Музычнага тэатра **Уладзімір Чабаткоў**. — *Гэта сур'ёзная прэм'ера са мноствам спецэфектаў, якія будуць упершыню прадэманстраваны на нашай тэатральнай сцэне. Пастаноўка мюзікла на тэатральнай сцэне — гэта наша ноў-хаў".*

Гастроляў тэатр сёлета не плануе ў сувязі з адсутнасцю фінансавай падтрымкі. Падвышэнне зарплат працаўнікоў тэатра таксама не чакае...

Да нас едуць лялькі з усёй Еўропы

Адрамантаваны ***Беларускі дзяржаўны тэатр лялек*** *адчыніць свае дзверы для маленькіх і дарослых аматараў лялечных спектакляў 26 верасня прэм'ерай "Балады пра белую вішню".*

У народнай памяці захавана шмат казак, паданняў і балад пра старадаўнія часы, калі наш край з усіх бакоў цяснілі чужынцы-заваёўнікі, а нашы продкі абаранялі свабоду роднага краю. Адна з такіх балад — "Балада пра белую вішню".

"Таксама ў самым пачатку сезона на нашай пляцоўцы пройдзе Міжнародны фестываль тэатраў лялек, які збярэ мноства гасцей з Еўропы", — распавяла "Народнай волі" загадчыца літаратурнай часткі Тэатра лялек **Дар'я Візнар**.

Хто любіць мадам Мархель?

Багатым на прэм'еры будзе новы сезон Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Аўтарскі спектакль **Мікалая Рудкоўскага** "Сляпая зорка", дэбют драматурга **Таццяны Ламонавай** і рэжысёра **Аляксандра Марчанкі** "Сола для падзорнай трубы з аркестрам", пастаноўка, падрыхтаваная спецыяльна для **Таццяны Мархель** (*на здымку*) "Хто любіць мадам" — гэта далёка не ўсё, што чакае тэатралаў.

Нядаўна тэатр вярнуўся з буйнейшага фестывалю сучаснай драматургіі ў Германіі.

"Фестываль ладзіцца з 1991 года, яго бюджэт складае 120 мільёнаў еўра, — паведамляе мастацкі кіраўнік РТБД Валерый Анісенка. — *Пасля фестывалю друкуюць велізарны фаліянт пра ўдзельнікаў. І сярод знакамітых тэатраў з 28 краін Еўропы ёсць і мы. Прэзідэнт фестывалю вельмі высока ацаніў нас. Мы адразу ж атрымалі запрашэнні на яшчэ некалькі тэатральных фестываляў — у прыватнасці, у Лейпцыг".*

Аднак творчы поспех, на жаль, не гарантуе матэрыяльнага спакою.

"Па статыстыцы, агучанай нядаўна, калгаснікі, медыкі і мы — самыя нізкааплатныя прафесіі, — нагадвае Анісенка. — *Да таго ж у нас няма ніякіх крытэрыяў па ацэнцы пастановак — ёсць толькі план запаўнення залы і продажу білетаў. Калі ён хоць на адну сотую не выкананы, мяне чубяць. А якасць спектакляў, якія ўзнагароды мы атрымліваем — гэта нікога не хвалюе. Мы ўсё стогнем і крычым, але нас ніхто не чуе... Мы прыраўноўваемся да абслугі — пральні ці шавецкай майстэрні.*

Галоўная наша праблема — памяшканне тэатра. На мой погляд, яго трэба аддаць Міністэрству культуры, бо мы кожны месяц плацім 5 тысяч доляраў за его арэнду. Дзяржава з кішэні ў кішэнь перакладвае грошы. Што, гэта разумна?"

Прэм'ера новага «армейскага» будынка

Драматычны тэатр беларускай арміі хутка здзівіць гледача сваім новым будынкам.

"Заканчваюцца рэканструкцыйныя работы, і цяпер у нас будзе адна з самых высокатэхналагічных і ўтульных залаў, — радуецца мастацкі кіраўнік тэатра **Аляксей Дудараў** (*на здымку*). — *Новая зала будзе прыгожая і кампактная — на 350 месцаў. У лістападзе мы запрашаем усіх на прэм'еру нашага новага будынка".*

Прэм'ерай тэатр таксама парадуе гледачоў — Дудараў аднавіў свой знакаміты спектакль "Радавыя".

Таксама ў планах Тэатра беларускай арміі — падрыхтаваць навагодняе прадстаўленне і казку.

"Будзем працягваць сваю ідэалогію тэатра моцных пачуццяў", — адзначае Аляксей Дудараў.

Арганізацыя гастроляў армейскага тэатра ўскладняецца фінансавымі пытаннямі.

"Гастролі — рэч дарагая, — кажа Дудараў. — *Але абменныя гастролі, на мой погляд, магчымы. Думаю, поўныя залы нам забяспечаны. Мы — зусім юны тэатр, больш пасля нас ніхто не нараджаўся. Таму цікавасць да нашай працы павінна быць..."*

Сучасны мастацкі тэатр ізноў прывозіць Пушкарову

Да адкрыцця сезона Сучасны мастацкі тэатр збіраецца аднавіць любімы публікай спектакль "Дванаццатая ноч".



"З новага сезона спектакль загучыць на новай ноце", — абяцае мастацкі кіраўнік тэатра **Уладзімір Ушакоў**.

Таксама Мастацкі тэатр сумесна са сваімі маскоўскімі калегамі рыхтуе спектакль "Старэйшы сын", у якім будуць занятыя **Нэлі Уварава** (выканаўца галоўнай ролі ў папулярным серыяле "Не нарадзіся прыгожай", на здымку), **Віктар Дабранраваў, Васіль Лукшын і Васіль Пракоф'еў**.

"Ужо зараз мы рыхтуемся да пяцігоддзя нашага тэатра, якое будзе адзначацца праз год, — кажа Уладзімір Ушакоў. — *Для пастаноўкі да гэтай даты мы запросім вядомага маскоўскага рэжысёра..."*

Ушакоў прызнаецца, што ў ягонага тэатра ёсць пэўныя праблемы, аднак не губляе аптымізму.

"У сувязі з эканамічнымі цяжкасцямі працаваць у Беларусі сапраўды праблемна, — гаворыць Ушакоў. — *Напрыклад, у нас не такі вялікі штат. Таму да некаторых рэчаў проста не даходзяць рукі — вось дагэтуль не дарабілі сайт... Але нейкія праблемы — рабочыя моманты. Яны павінны ўзнікаць для таго, каб калектыў мог актыўна жыць, а не проста існаваць. Любое "добра" прыходзіць праз "дрэнна". Нават у матэматыцы два мінусы даюць плюс. Кожны год Сучасны мастацкі тэатр нечым здзіўляў. Спадзяюся, і наступны сезон будзе цікавым і ўдалым".*

Дэбют Сяргея Кавальчыка

Раней усіх у гэтым сезоне адчыняецца Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага.

"Гэта беспрэцэдэнтная рань, — заяўляе кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі тэатра **Алена Бервольд**. — *Мы пайшлі на адпачынак 13 ліпеня і па шматлікіх просьбах гледачоў ужо 20 жніўня іграем першы спектакль — "Укрощение строптивой".*

Першая прэм'ера тэатра — гогалеўская "Жаніцьба" ў пастаноўцы **Валянціны Ераньковай** — адбудзецца 31 кастрычніка.

"Адразу пасля здачы "Жаніцьбы" мастацкі кіраўнік нашага тэатра Сяргей Кавальчык прыступае да працы над "Бегам" паводле Булгакава, — гаворыць Алена Бервольд. — *Гэта будзе яго першая пастаноўка ў нашым тэатры ў якасці рэжысёра.*

Насамрэч, мы шмат чаго чакаем ад гэтага сезона. Збіраемся паставіць казку... Таксама ў планах цудоўны французскі праект — п'еса "Распуснік" пра Дэні Дзідро, якую будзе ставіць Барыс Луцэнка. Аднак актуальнае пытанне фінансавання — калі французская амбасада праспансіруе нас, то прадставім і гэту прэм'еру".

У сувязі з раннім пачаткам сезона гастролі Рускага тэатра будуць нешматлікімі.

"На пачатку кастрычніка едзем на Воўкаўскі фестываль у Яраслаўль, адтуль — у Рускі тэатр у Вільнюсе, — гаворыць Алена Бервольд. — *На "Белую вежу" сёлета не збіраемся. Пастаянна туды ездзіць не мае сэнсу..."*

Рамонт у тэатры практычна скончаны. Праца ідзе толькі ў адміністрацыйнай частцы і знадворку.

"Яшчэ працягваецца рэканструкцыя ўваходнай групы, — адзначае Алена Бервольд. — *Побач тэатра з'явяцца новыя афішныя тумбы, ліхтары. Глядзельная зала і фае ў нас новенькія і прыгожыя, яшчэ не парэзаныя ўдзячнымі гледачамі".*

Колькі каштуюць квіткі?

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек: 2500—4000.
Нацыянальны драматычны тэатр імя Якуба Коласа: 3000—6000.
Дзяржаўны музычны тэатр Беларусі: 3500—18.000.
Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі: 5000—8000.
Драматычны тэатр беларускай арміі: 2000—7000.
Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы: 3500—15.000.
Сучасны мастацкі тэатр: 7000—40.000.
Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага: 3500—15.000.

У Коласаўскім — Эйнштэйн, Фрэйд і Ньютан

14 верасня традыцыйным спектаклем "Несцерка" адкрывае сезон Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа.

"Зараз рыхтуем пастаноўку пра Эйнштэйна да юбілею гэтага адметнага навукоўца, — кажа мастацкі кіраўнік Коласаўскага **Віталь Баркоўскі.** — *У галоўнай ролі будзе заняты наш любімы "Шагал" — Генадзь Гайдук (са спектаклем пра Марка Шагала, дзе Гайдук таксама іграў галоўную ролю, тэатр аб'ехаў амаль што паўсвета). Таксама можна будзе пабачыць і Фрэйда, якога будзе іграць Валянцін Цвяткоў, і Ньютана ў абліччы народнага артыста Беларусі Тадэвуша Кокштыса".*

Зараз Віцебскі тэатр чакае прэзідэнцкага гранту на спектакль пра Еўфрасінню Полацкую ў пастаноўцы **Міхася Краснабаева**.

На заробкі служыцелі віцебскай Мельпамены таксама не скардзяцца. *"Заробкі ў нас кожны год павялічваюцца,* — кажа Баркоўскі. — *Сённяшняя сярэдняя зарплата акцёра — 400 долараў. Для нашай абласной прасторы, дзе ўсё каштуе танней, чым у сталіцы, гэта не надта дрэнна..."*

Адзінай тэатральнай праблемай мастацкі кіраўнік Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа вызначае недахоп гледача.

"Зала у нас запаўняецца публікай добра, але публіка і глядач — розныя рэчы, — адзначае Віталь Баркоўскі. — *Публіка любіць камедыі, бо ідзе на спектакль адпачыць. А нам хацелася б, каб было больш дасведчаных гледачоў — тых, хто ідзе ў тэатр, каб падумаць. Бывае, што спектакль праходзіць 10—15 разоў, і глядач "канчаецца.*

У мяне, напрыклад, ёсць спектакляў 5—6, якія атрымалі Гран-пры на міжнародных і айчынных фестывалях, але ў тэатры яны не запатрабаваны. Прэм'ерныя паказы праходзяць добра, а потым мы не бачым таго гледача, якога чакаем. Мабыць, справа ў далейшым росце культуры і адукацыі нашых людзей..."

Вольга ПРУДНІКАВА.

ТЕОРИЯ ВЕРОЯТНОСТИ

Надежда на фортуну,

или Кое-что об астрологии

— В 1974 году вышла книга астрологов Гриббина и Плейммана под названием "Эффект Юпитера". В ней говорилось, что 10 марта 1982 года все планеты окажутся по одну сторону от Солнца, и этот "парад планет" вызовет на нем возмущения, убийственные для Земли. Но ничего страшного не случилось.

У древнейшей, загадочной науки астрологии миллионы приверженцев. Среди них были Пифагор, Парацельс, Иван Грозный, Черчилль, Рейган и многие другие известные в истории личности. Однако наука это или лженаука? Липкая паутина, в сети которой попадают даже сильные мира сего, или некая особая система знаний? "Ветреная дочка астрономии", как кто-то иронично заметил еще на заре Нового времени, или дерзкая разведчица будущего? Мнения ученых расходятся...



Верны потому, что туманны?

Суждения тех, кто высказывается в пользу того, что астрология — настоящая наука, базируются на следующем. Первое. Подобно тому, как алхимия со временем превратилась в химию, так и астрология сейчас постепенно приобретает новое название — геокосморитмология. Кроме того, можно вспомнить: ведь совсем недавно лжеучеными называли генетиков и кибернетиков.

Второе. Многовековая практика показала, что знак зодиака зачастую довольно правильно определяет психофизиологическую характеристику человека. Необходимо только, например, при составлении гороскопа ("показателя часа") учитывать время рождения с точностью до минут. Это объясняется так: Земля вращается вокруг Солнца и вокруг своей оси, и по ходу годичного цикла каждый из нас при рождении получает свою порцию космического облучения. В результате чего характеры людей, родившихся под одним знаком, схожи. Вообще же, астрология, считают ее приверженцы, — это наука, изучающая взаимосвязь человека и космоса и выясняющая законы гармонизации внутренних биоритмов и внешних ритмов природы и общества.

Но здесь следовало бы заметить: получается, астрологические предсказания верны потому, что пригодны для всех. Ведь человек частенько склонен принимать на свой счет общие утверждения, если они состоят из неких непонятных ему фактов. В течение тысячелетий астрология была инструментом предсказаний и ключом к загадочной и пугающей книге судеб. Несмотря на все оговорки, отказаться от привычной роли пророчицы астрология не в силах и сегодня (что, кстати, подтвердили автору этих строк некоторые практикующие нынче в Минске астрологи). Данной цели подчинено и создание гороскопов — главного ее детища.

"Попса" и беллетристика

Между тем большинство ученых считают астрологию лженаукой и даже бредом.

Они, во-первых, задаются вопросом: как могут влиять на человека далекие планеты, если силы их тяготения несравнимо меньше даже силы, с которой люди сотрясают воздух, разговаривая друг с другом?

Во-вторых, составить гороскоп несложно. Главное, чтобы все формулировки и утверждения были нестрогими, гибкими, допускающими их "подгонку" под большое количество людей и событий. Именно сего правила придерживался небезызвестный Нострадамус. Это лишь в ряде современных трактовок он становится буквально ясновидящим, тогда как его тексты в оригинале крайне запутанны и при желании их нетрудно "адаптировать" под уже произошедшие события.

Наконец, в-третьих, по мнению ученых, примерно 90 процентов астропрогнозов — "попса" и беллетристика. Даже среди, так сказать, профессиональных астрологов есть множество закоренелых материалистов, которые составлением гороскопов простонапросто подрабатывают.

Если не сбывается, то быстро забывается

Не так давно американские астрономы Джордж Калвер и Кристина Йена проверили опубликованные за пять лет предсказания некоторых современных астрологов, сделанные для политиков, кинозвезд и других знаменитостей. Оказалось, что в итоге исполнилось лишь около 10 процентов предсказаний. Наверное, любой человек, внимательно следящий за политическими событиями, новостями искусства и светскими сплетнями, мог бы справиться с подобным делом лучше.

В общем, получается, планеты приводят астрологов к неверным выводам в девяти случаях из десяти. Следовательно, вряд ли такого рода прогнозы могут служить надежным руководством при решении государственных задач или обычных житейских проблем. Но таков уж у многих из нас психологический настрой: если совпадает хотя бы один случай, момент из тысячи, он-то и запоминается. А если прогнозы не сбываются, они быстренько забываются. Это, видимо, нужно помнить, читая разного рода и, кстати, весьма отличающиеся по содержанию астрологические "изыскания".

Комментарий специалиста

— Вера в гороскопы, нумерологию, счастливый случай и тому подобное — просто-напросто архаичная вера человека в чудо, — отметила в беседе со мною завкафедрой психотерапии Белорусской медицинской академии последипломного образования Ирина Байкова. — Архаические мифы с незапамятных времен передавались из поколения в поколение и генетически в нас закреплялись. Сегодня очень многое можно объяснить рационально, с позиций технического прогресса, научных достижений. Надежда же на фортуну, гороскопы, разного рода прогнозы — не что иное, как стремление переложить ответственность за свою жизнь на некий источник, от человека не зависящий, и заявить: я здесь ни при чем, так звезды распорядились. Это инфантильный, детский способ избежать личной ответственности. Человек должен активно относиться ко всему происходящему вокруг. И наоборот, пассивность, желание избежать обсуждения, решения возникающих проблем ни к чему хорошему не приведет...

— 11 августа 1999 года, в день, когда полное солнечное затмение совпало с "парадом планет", многие СМИ вспомнили пророчество Нострадамуса: "С неба явится великий король ужаса, который все уничтожит". Ничего подобного не произошло.

Игорь ГРИШАН.

ЗДАРЭННЕ

Атрымаў канверт з белым парашком

Пасланне з пагрозай і белы парашок атрымаў 71-гадовы жыхар вёскі Куляшы Вілейскага раёна.

Як паведамілі БелаПАН ва УУС Мінаблвыканкама, увечары 6 жніўня пенсіянер знайшоў у сваёй паштовай скрыні канверт. На ім ручкай быў напісаны яго адрас без звестак адпраўніка. У канверце знаходзіўся складзены ўдвая ліст са школьнага сшытка ў клетку з надпісам "Смерць го(а)ду". У лісток быў укладзены самаробны склеены пакет з паперы з невядомым парашком белага колеру.

Канверт са змесцівам накіраваны ў Маладзечанскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі для экспертызы.

І за акіянам ім не жывецца

Да 16 гадоў турмы асуджаны ў ЗША за забойства жонкі 27-гадовы беларус Дзмітрый Сімановіч. Пасля выхаду на волю яго дэпартуюць.

Нагадаем, у чэрвені 2007 года сварка Дзмітрыя і Іны Сімановіч, якія жылі ў Эшвілі (ЗША, Паўночная Караліна), закончылася трагедыяй. Праз месяц Сімановіч самастойна з'явіўся ў паліцыю і ва ўсім прызнаўся.

Як паведамляе БелаПАН, сваю жонку беларус задушыў. Яна была на трэцім месяцы цяжарнасці. Падчас следства забойства было перакваліфікавана ў ненаўмыснае, інакш Сімановічу пагражала б смяротнае пакаранне альбо пажыццёвае зняволенне.

КРЫЖАВАНКА

Да Свята беларускага пісьменства і друку ў г.Барысаве

Па гарызанталі: 1.Найбуйнейшая жывёла на Беларусі, якая водзіцца ў Белавежскай пушчы і Бярэзінскім запаведніку. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. 3.Старажытная эмблема г.Барысава, якая была надана гораду ў 1792 г. 6.Унутраная частка чаго-небудзь. 8.Смелы, горды чалавек (перан.). 10."... — Нёман". Французскі авіяполк, які ўдзельнічаў у вызваленні г.Барысава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 11.Акцыянернае таварыства, а таксама назва футбольнай каманды г.Барысава. 13.Паэма, якую напісаў Я.Купала ў 1934 г., у часы наведвання г.Барысава і раёна. 14.Аўтар вершаваных твораў. Ім быў ураджэнец в.Зембін Барысаўскага раёна Ізі Харык, 110 год з дня нараджэння якога адзначаецца сёлета. 19.Снапочак к снапочку, дык цэлая ... (прык.). 20.Барысаўская... — узвышша, якое займае паўднёва-заходнюю частку Барысаўскага раёна. 22.Займальны па сюжэце фальклорны твор. 23.Кароткая выснова з напісанага (кніжн.). 24.Горад у Польшчы, у музеі якога знаходзіцца карціна мастака Я.Сухадольскага, ураджэнца г.Гродна, "Пераход арміі і Напалеона цераз Бярэзіну". 27.Адзін з карысных выкапняў, на які багатая Барысаўшчына. 28.Выбыццё са складу чаго-небудзь (перан.). 30.Вёска на Барысаўшчыне, дзе ў 1905—1906 гг. настаўнічаў Я.Маўр; сёлета — 125 год з дня нараджэння. 31.Пісьмовы пералік каго-, чаго-небудзь. 33.Вядомы савецкі пісьменнік, аўтар рамана "Жывыя і мёртвыя" і інш., які ў сваіх артыкулах з лініі фронту асвятляў ваенныя падзеі на Барысаўшчыне. 36.Старажытныя ісландскія, ірландскія, нарвежскія аповесці. 40.Вядомы беларускі скульптар, прафесар, аўтар шматлікіх помнікаў, мемарыяльных комплексаў. Ураджэнец г.Барысава. 41."Наш ..." — часопіс Барысаўскага таварыства краязнаўцаў, які выходзіў у 20-х гадах XX ст. 42.Імя беларускага фалькларыста, этнографа, бацькі паэта М.Багдановіча, ураджэнца г.п.Халопенічы былога Барысаўскага павета. 43.Беларускі мастак, аўтар партрэтаў беларускіх дзеячаў В.Захаркі, А.Смоліча, В.Ластоўскага і іншых. Ураджэнец Барысаўшчыны. 44.Узнагарода пераможцу ў спаборніцтве.

Па вертыкалі: 1.Партызанская... Тэрыторыя, якая ў часы акупацыі фашыстамі Барысаўшчыны знаходзілася пад поўным кантролем партызан. 2.Грузавое несамаходнае судна. 4.Адна з некалькіх паездак (разм.). 5.Усходнеславянскі паэт, пясняр. 6. ...з-пад Зембіна. Адзін з псеўданімаў паэта, фалькларыста Івана Гаеўскага, ураджэнца Барысаўшчыны. 7.Рэчка, якая існавала ў сярэднявеччы, і па назве якой, згодна з меркаваннямі археолага М.Ткачова, узнікла назва г.Барысава. 9.Вядомая французская мастачка беларускага паходжання, ураджэнка в.Зембін. 11.Назва помніка прыроды, вялізнага камення, які знаходзіцца ў наваколлі в.Мсціж. 12.Фелікс ... — беларускі паэт-дэмакрат XIXст., творчасць якога сугучна паэзіі Ф.Багушэвіча. Сёлета — 170 год з дня яго нараджэння. 15.Назва Барысаўскай раённай газеты. 16.Самадзейны драматычны калектыў, які быў створаны ў г.Барысаве ў 1933г. (абрэв.). 17.Дамінік ... — асветнік, ураджэнец Міншчыны. Стрыечны брат вядомага кампазітара Станіслава ... Сёлета — 220 год з дня яго нараджэння. 18.Беларускі мастак, творы якога знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, а таксама ў прыватных калекцыях многіх краін свету. Ураджэнец г.Барысава. 20.Аснова, апора (перан.). 21.Найбольш дзейная, ініцыятыўная частка калектыву. 25.Фальклорны твор казачна-легендарнага зместу. 26.Рака на паўднёвым усходзе Барысаўскага раёна, прыток р.Бобр. 29.Алесь ... — беларускі пісьменнік, драматург. Аўтар зборніка вершаў "Лірнік", п'есы "Слова — не верабей" і іншых. Доўгі час жыў і працаваў у г.Барысаве. 32.Святы ... — апостал, выява якога прысутнічае на гербе г.Барысава. 34.Мэтанакіравана сфарміраваны вобраз асобы, з'явы і інш. 35.Даглядчык авечак. 38.Назва партызанскага атрада, які дзейнічаў на тэрыторыі Барысаўшчыны, камандзір якога Ф.Азміцель быў удастоены пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза. 38.Манера, стыль (перан.). 39.Народнае эпічнае апавяданне аб падзеях мінулага або сучаснасці.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.



АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, НАДРУКАВАНУЮ ў №№105—106

Па гарызанталі: 3.Капец. 8.Брукар. 9.Галера. 12.Шаша. 13.Апора. 14.Аміяк. 15.Плошча. 16.Фурман. 19.Прагон. 21.Параход. 22.Хронас. 24.Шпілеўскі. 25.Сыракомля. 26.Адгода. 28.Маршрут. 30.Асадка. 32.Фрэгат. 33.Фургон. 35.Траса. 38.Вілія. 40.Шлях. 41.Віціна. 42.Ягайла. 43.Адкос.

Па вертыкалі: 1.Карта. 2.Вакзал. 3.Карэта. 4.Паселішча. 5.Цягнік. 6.Калёсы. 7.Орша. 10.Дарога. 11.Лоцман. 17.Капітан. 18.Подступ. 19.Пошта. 20.Ніўка. 22.Хмара. 23.Свята. 27.Грэбля. 29.Шукальнік. 31.Догляд. 34.Дзвіна. 35.Талака. 36.Альянс. 37.Дубасы. 39.Ялік. 40.Шклоў.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

«Шукаю «Народную волю»...»

Лісты, пра якія мы гаварылі ў мінулым звароце, паступаюць у рэдакцыю і ў гэтыя дні. І амаль ўсе заканчваюцца прыкладна так: вярнуўся з адпачынку, гляжу, а ў паштовай скрынцы няма "Народнай волі". І зараз шукаю газету, у каго можна ўзяць і пачытаць.

Так, накіроўваючыся на адпачынак, многія сапраўды не зрабілі **перадаплату** за нумары ў другім паўгоддзі. Зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. Для гэтага тэрмінова зазірніце ў любы філіял "Беларусбанка" ці наведайце бліжэйшае паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апеларатыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары другога паўгоддзя — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* **100961759**
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа	Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)		
Плательщик	Пеня	
	Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* **100961759**
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа	Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)		
Плательщик	Пеня	
	Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и обязательно отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия ____________

имя ____________ **отч.** ____________

индекс почтового отделения ☐☐☐☐☐☐

область ____________

район ____________

название населенного пункта ____________
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное— подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)* ____________

дом ____ *а,б,в,г* **корп.** ____ **кв.** ____

(Примечание: если можете— укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ЗНАХОДКІ

З часоў антычнасці

У старадаўняй частцы Светлагорска (Гомельская вобласць) — у Шацілках — знайшлі рэчы часоў антычнасці. Пра гэта паведаміў адзін з удзельнікаў археалагічнай экспедыцыі Тэльман Маслюкоў.

Паводле яго слоў, на раскопках працуе група навучэнцаў, якія скончылі першы курс Светлагорскага індустрыяльнага каледжа па будаўнічай спецыяльнасці. Кіруе групай майстар вытворчага навучання Генадзь Рызнавокі. "Цікава, што ўпершыню ён браў удзел у раскопках яшчэ калі сам быў школьнікам. Трэці год майстар праводзіць практыку на раскопках, якія вядуцца ў Светлагорскім раёне пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук Сяргея Рассадзіна", — зазначыў Т.Маслюкоў.

Паводле пісьмовых звестак, Шацілкі вядомыя з 1560 г. як вёска. У 1961 г. Шацілкі атрымалі статус горада з цяперашняй назвай — Светлагорск. Падчас леташніх раскопак высветлілася, што паселішча існавала тут яшчэ ў перыяд Тураўскага княства — у IX—X стагоддзях. Затым быў адкрыты культурны слой ранняга сярэднявечча (VI—VII ст.). А нядаўна вызначана, што вісочныя кольцы гунна-аварскага тыпу, знойдзеныя пры раскопках, адносяцца да V стагоддзя, г. зн. да эпохі антычнасці.

Тэльман Маслюкоў паведаміў, што ён прапанаваў пачаць археалагічныя даследаванні ў Шацілках яшчэ ў 2006 годзе. Першыя разведкі выканала кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Наталля Дубіцкая. З 2007 года рэгулярныя раскопкі ў Шацілках праводзіць Сяргей Рассадзін — прафесар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, член Геральдычнага савета пры прэзідэнце Беларусі. Даследаванні фінансуюцца з дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў.

Сяргей ПУЛЬША.

Адрас рэдакцыі:

220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 13.08.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 026 экз. Заказ №